ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 41 (591) | Субота, 30 лістапада 1946 года. | Цана 50 кап.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР

Аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР

У сувязі з заканчэннем поўнамоцтваў Вярхоўнага Совета Беларускай ССР першага склікання, на падставе артыкула 63 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», які ўстанаўляе, што дзень выбараў у Вярхоўны Совет Беларускай ССР аб'яўляецца не пазней, чым за два месяцы да тэрміну выбараў і што выбары праводзяцца ў нерабочы дзень, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР **пастанаўляе:**

Назначыць выбары ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР на нядзелю 9 лютага 1947 года.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
К. ДЛУГАШЭЎСКІ.

В. аб. Сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
А. БОНДАР.

26 лістапада 1946 года
гор. Мінск.

Выбары ў Вярхоўны Совет БССР

Апублікаваны Указ аб новых выбарах у Вярхоўны Совет БССР, якія адбудуцца 9-га лютага 1947 года.

З часу апошніх выбараў у Вярхоўны Совет БССР прайшло амаль 8 гадоў, з іх 4 гады было нашым народам аддадзена тытанічнай барацьбе супроць крывавых фашысцкіх зграй, якія напалі на нашу Радзіму.

Асаблівыя пакуты за гэтыя чатыры гады перанёс беларускі народ, які доўгі час знаходзіўся пад фашысцкай акупацыяй. Але ён не скарыўся ворагу. Як адзін чалавек, узняўся беларускі народ на змаганне з крывавымі гітлераўскімі разбойнікамі. Лясы Беларусі былі перапоўнены партызанамі. Ні па чыгунцы, ні па шасэ, ні па гасцінцах не маглі спакойна праехаць гітлераўцы. Усюды іх падпільноўвала смерць ад рукі народных мсціўцаў.

Больш чым 300-тысячная армія партызан, сотні тысяч байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, — вось як беларускі народ адказаў на фашысцкае нашэсце.

У дні Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ прадэманстраваў сваю згуртаванасць, маналітнасць, бязмежную адданасць вялікай партыі Леніна—Сталіна.

«Айчынная вайна паказала, што совецкі народ здольны тварыць цуды і выходзіць пераможцам з самых цяжкіх выпрабаванняў», — гаварыў таварыш Сталін.

Беларускі народ вельмі пераканаўча гэта паказаў у прайшоўшай вайне.

Вось ужо паўтары гады, як наша краіна працуе ў мірных абставінах. Яна прыступіла да здзяйснення чацвертай сталінскай пяцігодкі. Асабліва вялікія задачы па аднаўленню і далейшаму развіццю народнай гаспадаркі прадстаяць у Беларусі, бо разбурэнні, учыненыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі, тут велізарныя.

Беларускі народ у мінулыя выбары аддаў свае галасы кандыдатам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. І не памыліўся. Дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ў працы, і ва ўзброенай барацьбе з ненавісным ворагам аказаліся вернымі слугамі народа, да апошняй кроплі крыві аддаднымі вялікай справе соцыялізма. Цяпер, калі трэба прыкласці ўсе сілы для здзяйснення вялікага сталінскага плана работ, нашы рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя зноў дружна аддадуць свае галасы за блок комуністаў і беспартыйных, як за лепшых прадстаўнікоў народа, выразнікаў яго волі, абаронцаў яго інтарэсаў. Беларускі народ, абіраючы сваіх дэпутатаў у Вярхоўны Совет, дасць ім цвёрды сталінскі наказ:

«Каб яны... аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу; каб яны былі такімі-ж яснымі і акрэсленымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак сама свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін; каб яны былі гэтак сама мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін; каб яны гэтак сама любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтва Беларусі маюць не малы вопыт удзелу ў выбарчых кампаніях. Даволі ўспомніць іх работу ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР у 1937 годзе, затым у Вярхоўны Совет БССР у 1938 годзе і ў Вярхоўны Совет СССР у пачатку гэтага года. Пісьменнікі сваім палымяным мастацкім словам заклікалі народныя масы цясней згуртавацца вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, аддаць свае галасы кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных. Работнікі мастацтва выступалі перад выбаршчыкамі, афармлялі выбарчыя вучасткі.

Гэты каштоўны вопыт мусіць быць асабліва шырока скарыстаны ў надыходзячай выбарчай кампаніі.

Партыйныя арганізацыі Саюза пісьменнікаў, Саюза мастакоў, тэатраў, устаноў, якія кіруюць мастацкай самадзейнасцю, павінны загадзя распрацаваць падрабязныя мерапрыемствы ўдзелу нашай мастацкай інтэлігенцыі ў перадвыбарчай кампаніі.

Прапаганда дасягненняў Совецкай Беларусі за 28 гадоў існавання, выяўленне велізарнейшай ролі беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, паказ цудоўных перспектыў, якія адкрываюцца для БССР здзяйсненнем сталінскай пяцігодкі,—усё гэта з поспехам могуць зрабіць пісьменнікі, дзеячы тэатра, мастакі. Яны павінны непасрэдна працаваць на выбарчых участках і з выбаршчыкамі, а, галоўнае, яны павінны сваёй літаратурна-мастацкай зброяй дапамагаць паспяховаму правядзенню выбараў.

У мінулыя выбары пісьменнікі і работнікі мастацтва прарабілі вялікую працу па агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Цяпер іх актыўнасць павінна яшчэ павялічыцца. Верш, нарыс, апавяданне, вершаваны лозунг, аратарыя, спектакль, карціна, плакат, мастацкая самадзейнасць, — усё гэта павінна быць пастаўлена на службу перадвыбарчай і выбарчай кампаніі. Трэба стварыць атмасферу ўздыму, свята вакол такой велізарнейшай падзеі ў жыцці беларускага народа, як выбары ў Вярхоўны Совет БССР.

Перадвыбарчая кампанія сёлета супадае з 10-годдзем з дня прыняцця Вялікай хартыі соцыялістычнага чалавецтва — Сталінскай канстытуцыі.

Совецкія пісьменнікі і дзеячы мастацтва ў сваіх творах павінны паказаць усяму свету, якіх выдатных поспехаў дасягнула наша соцыялістычная Радзіма пад сонцам Сталінскай канстытуцыі, якія велізарнейшыя выпрабаванні вытрымаў наш совецкі лад, наша дружба народаў. Гэта будзе цудоўная эпапея, якая адлюструе нябачанае ў свеце маральна-палітычнае адзінства народа, згуртаванага вакол вялікай і непераможнай партыі Леніна—Сталіна, гэта будзе велічны гімн аб 16 свабодных совецкіх соцыялістычных рэспубліках, якія пад кіраўніцтвам мудрага Сталіна ўпэўнена ідуць да комунізма.

Паседжанне вучонага совета, прысвечанае літаратурнай і грамадскай дзейнасці Якуба Коласа

24 лістапада адбылося ўрачыстае паседжанне вучонага совета Беларускага Дзяржаўнага універсітэта, прысвечанае 40-годдзю літаратурнай і грамадскай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

Рэктар універсітэта дацэнт П. Савіцкі ва ўступным слове ахарактарызаваў выдатную дзейнасць народнага паэта. З успамінамі аб выкладчыцкай дзейнасці Якуба Коласа ва універсітэце выступіў дацэнт М. Жыркевіч. Пісьменнікі Пятрусь Броўка, Максім Танк, Максім Лужанін прачыталі вершы, прысвечаныя Якубу Коласу.

Прывітанне юбіляру ад вучонага совета і грамадскіх арганізацый універсітэта прачытаў дацэнт М. Ларчанка.

У заключэнне, цёпла сустрэты прысутнымі, выступіў народны паэт Беларусі, лаўрэат Сталінскай прэміі, акадэмік Якуб Колас, які падзякаваў за віншаванні і прачытаў некалькі сваіх вершаў.

С. М. Кіраў на трыбуне.

Нікалай Ціханаў

КІРАЎ З НАМІ

(Урыўкі з паэмы)

У жалезных начах Ленінграда
Па гораду Кіраў ідзе.
А ў сэрцы бязмежная радасць,
Што людзі ўзмужнелі ў бядзе.
Нястомны совецкія людзі
На варце радзімай зямлі...
Гарматныя стрэлы нас будзяць,
Снарады ўжо блізка ляглі.
І бомбы ўжо сыпяцца градам,
Дом падае, сцелецца дым.
І дзеўчына разам з атрадам
Бясстрашна спяшае туды.
Юнацкія крочаць атрады,
Такія не згінуць нідзе.
У жалезных начах Ленінграда
Па гораду Кіраў ідзе...
Траншэі кругом, барыкады.
Трывожныя твары ў людзей.
У жалезную ноч Ленінграда
За горад ён ціха ідзе.
Ён бачыць: ўзлятаюць ракеты
У пажараў начную зару.
Там ворагаў лютых пікеты,
Там лагер нямецкіх звяруг.
Там глуха трашчаць аўтаматы,
І ўспышкі, бы ўсплёскі нажа,
У цмяным мігценні, як каты
Падбітыя танкі ляжаць.
Да горада лезе палкамі:
Дай дом свой, прытулак для зграй,
Вантробы набі пірагамі,
Дачку яму, жонку аддай.
Ён страшны, абвешаны зброяй,
Апрануты ў футры жанчын,
Ірвецца дарогай глухою
У хатнім цяпле адпачыць.
Ды шлях засланіць супастату
Ідзе наш народ малады,
Выходзіць з смяротнай гранатай
Стары супроць змрочнай арды.
Ідзе наш народ малады,
Спяшаюцца цяжкія ў бой.
На вежы адной: «За Радзіму»
І «Кіраў»—на вежы другой.
Каб лютым агнём кананады
Нямецкую знішчыць арду,
У жалезных начах Ленінграда
На бой ленінградцы ідуць.
Сцягі палымнеюць над імі,
Там страшная помста гудзе,
І Кірава грознае імя
На бой ленінградцаў вядзе!

Пераклад з рускай мовы.

Памяці С. М. Кірава

Дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна да 12-ай гадавіны з дня злачыннага забойства ворагамі народа выдатнага дзеяча большэвіцкай партыі і совецкай дзяржавы С. М. Кірава арганізавала спецыяльную выстаўку, прысвечаную жыццёваму шляху і дзейнасці палымянага рэволюцыянера. На выстаўцы — фотаздымкі, якія паказваюць дзейнасць С. М. Кірава ва ўсе перыяды жыцця, выказванні аб ім І. В. Сталіна, а таксама прамовы і артыкулы С. М. Кірава.

На выстаўцы ёсць раздзел, прысвечаны тэме «Кіраў у мастацкай літаратуры».

Выстаўка аб С. М. Кіраве таксама арганізавана і ў Доме партыйнай асветы.

Бібліятэка імя А. М. Горкага зрабіла для дакладчыкаў і сваіх чытачоў падбор літаратурных матэрыялаў і кансультацыю аб выдатнай дзейнасці С. М. Кірава.

Аб 125-годдзі з дня нараджэння Н. А. Някрасава

У сувязі з тым, што 4 снежня 1946 г. спаўняецца 125 год з дня нараджэння вялікага рускага паэта Н. А. Някрасава, Совет Міністраў Саюза ССР пастанавіў:

1. Зацвердзіць Усесаюзны Камітэт па правядзенню 125-годдзя з дня нараджэння Н. А. Някрасава ў наступным складзе: Фадзееў А. А. (старшыня), Айбек Муса, Барбарус (Варэс І.), Вавілаў С. І., Гулям Гафур, Яўгеньеў-Максімаў В. Е., Яголін А. М., Ісаакян А. С., Ільін Н. В., Ісакоўскі М. В., Калашнікаў А. Г., Кірпоцін В. Я., Колас Якуб, Качалаў В. І., Лебедзеў-Кумач В. І., Лебедзеў-Палянскі П. І., Мешчанінаў І. І., Міхайлаў Н. А., Міхалкоў С. В., Арлоў Д. Н., Палецкіс Ю. І., Пахомаў А. Ф., Пластоў А. А., Пракоф'еў А. А., Розанаў І. Н., Суркоў А. А., Твардоўскі А. Т., Ціхаваў Н. С., Турчанінава Е. В., Тычына П. Г., Упітс А. М., Храпчанка М. Б., Чукоўскі К. І., Шмарынаў Д. А.

2. Ускласці на Усесаюзны Камітэт па правядзенню 125-годдзя з дня нараджэння Н. А. Някрасава: распрацоўку мерапрыемстваў па ўвекавечанню памяці Н. А. Някрасава, садзейнічанне шырокай папулярызацыі сярод працоўных Совецкага Саюза творчасці Н. А. Някрасава, правядзенне ў г. Маскве ўрачыстага паседжання ў дзень 125-годдзя з дня нараджэння Н. А. Някрасава.

3. Выдаць на працягу 1946—1949 г. г. поўны збор твораў Н. А. Някрасава, прыстасаваўшы выхад І тома да 4 снежня 1946 г.

4. Устанавіць у г. г. Ленінградзе і Яраслаўлі помнікі Н. А. Някрасаву.

(ТАСС)

Дэлегацыя Ўсеславянскага Камітэта на славянскі кангрэс у Белградзе

8 снежня ў Белградзе адкрываецца славянскі кангрэс. Для ўдзелу ў гэтым кангрэсе Ўсеславянскі Камітэт выдзеліў дэлегацыю. У складзе яе 20 чалавек: А С. Гундараў (кіраўнік дэлегацыі), Л. С. Баранаў, А. А. Вазнясенскі, Н. С. Дзяржавін, Б. Д. Грэкаў, В. В. Вішнеўскі, Ф. Н. Талбухін, А. В. Сцяпанаў, В. В. Мачалаў, А. Е. Карнейчук, М. Ф. Рыльскі, С. А. Коўпак, Н. С. Карпенка, А. Ф. Фясенка, П. В. Саевіч, Л. П. Александроўская, В. А. Парахневіч, Ф. П. Трушэвіч, А. В. Пашкевіч, мітрапаліт Нікалай Круціцкі.

29 лістапада дэлегацыя спецыяльным цягнікам выязджае ў Белград. Яна вязе на кангрэс вялікую выстаўку «Уклад СССР у справу разгрому фашысцкай Германіі», якая будзе часткай агульнай выстаўкі ўсіх славянскіх народаў.

(ТАСС).

Адкрыццё сезона ў Яўрэйскім тэатры

У Мінску 26 лістапада адбылося адкрыццё тэатральнага сезона ў Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры БССР. Быў паказаны спектакль «200 000» Шолам-Алейхема ў пастаноўцы народнага артыста БССР В. Галаўчынера.

Музыка да спектакля напісана Я. Розенфельдам, афармленне А. Канстанцінаўскага. Спектакль «200 000» быў цёпла сустрэты гледачом.

У Цэнтральным Камітэце КП(б) Беларусі

АБ РАБОЦЕ ЧАСОПІСА „БЕЛАРУСЬ"

ЦК КП(б)Б абмеркаваў пытанне аб рабоце грамадска-палітычнага і літаратурнага часопіса «Беларусь».

У прынятай пастанове ЦК КП(б)Б адзначыў сур'ёзнейшыя недахопы ў рабоце часопіса і яго рэдкалегіі. За апошні час, побач са значнымі і ўдалымі творамі, у часопісу з'явілася шмат безыдэйных, ідэалагічна шкодных і ў мастацкіх адносінах нізкапробных твораў.

Многія вершы, апавяданні і нарысы, апублікаваныя ў часопісу, ідэйна не ўзбройваюць чытачоў, не дапамагаюць ім правільна ацаніць гераічную барацьбу совецкага народа ў дні Вялікай Айчыннай вайны і ў перыяд мірнага будаўніцтва. Павярхоўны паказ падзей, нізкі ідэйны і мастацкі ўзровень, адсутнасць сапраўдных станоўчых герояў, няўменне абагульняць тыповыя жыццёвыя з'явы—вось найбольш характэрныя недахопы многіх апавяданняў і нарысаў, апублікаваных у часопісу («Журба і Монцік»—А. Алешкі, «Жыў на свеце Лявон» — І. Гурскага, «Клава»—М. Лупсякова, «Апавяданне пра нястрымнае сэрца» — І. Грамовіча, «У паветры»—П. Кавалёва і іншыя).

З'яўляючыся грамадска-палітычным і літаратурным часопісам, «Беларусь» запаўняецца, галоўным чынам, літаратурна-мастацкім матэрыялам, які выцясняе грамадска-палітычную тэматыку.

Тэматыка літаратурных твораў часопіса вузкая і аднастайная. Ён часта друкуе няўдалыя творы, якія малююць жыццё вёскі, і амаль зусім не змяшчае матэрыялаў аб гераічнай працы рабочага класа Беларусі па аднаўленню разбуранай нямецкімі акупантамі гаспадаркі і будаўніцтву новых буйнейшых індустрыяльных прадпрыемстваў.

Падобная тэндэнцыя прыводзіць да змяншэння, на старонках часопіса, вядучай ролі рабочага класа ў совецкім грамадстве.

У выніку адсутнасці большэвіцкай адказнасці і наяўнасці беспрынцыповасці і ўгодніцтва пры ацэнцы асобных твораў з боку работнікаў рэдакцыі ў часопісу з'явіліся такія творы, як «Маленькая хмарка»—М. Клімковіча, «Свае людзі»—І. Гурскага, «Балбатун»—Я. Маўра, у якіх фальшыва і ў скажоным выглядзе паказваецца жыццё калгаснай вёскі. Героі гэтых твораў, малакультурныя і забітыя, жывуць адсталымі інтарэсамі і не падтрымліваюць ініцыятыву кіраўнікоў, абыякава ставяцца да калектыўнай гаспадаркі, гавораць вульгарнай і пошлай мовай. Рэдакцыя часопіса дапусціла грубую памылку, надрукаваўшы аб жыцці калгаса тры ўбогія і лёгкадумныя камедыі і не даўшы ніводнага праўдзівага і глыбокага твору аб новых, сапраўды перадавых людзях совецкай вёскі, якія самааддана працуюць над адраджэннем вызваленай Радзімы.

Многія аўтары, якія супрацоўнічаюць у часопісу, слаба звязаны з працоўнымі масамі і не чэрпаюць у іх асяроддзі праўдзівы матэрыял для сваёй творчай работы. Яны дрэнна назіраюць і вывучаюць жыццё, адстаюць ад падзей, баяцца брацца за распрацоўку тэм, якія патрабуюць уважлівай і ўпартай працы, непрадумана і безуважна падыходзяць да вырашэння сур'ёзных пытанняў, што і прыводзіць да з'яўлення безыдэйных, а іншы раз і пошлых твораў.

Часопіс дапусціў палітычную памылку, прадставіўшы на сваіх старонках месца для палітычна шкоднага артыкула прафесара А. Ус—«Да вытокаў беларускага выяўленчага мастацтва», у якім яўна адчуваецца буржуазна-нацыяналістычны погляд аўтара.

Зусім нездавальняюча пастаўлена ў часопісу «Беларусь» крытыка і бібліяграфія. Боязнь сапсаваць прыяцельскія адносіны з пісьменнікамі зніжае ідэйны і прынцыповы ўзровень крытыкі. Большасць крытычных артыкулаў і рэцэнзій напісана павярхоўна, у хвалебным і ўгодніцкім тоне, без глыбокага разбору і марксісцка-ленінскага аналіза твораў, і дае ва многіх выпадках супярэчлівыя і незаслужаныя ацэнкі (артыкул В. Агіевіча і М. Ларчанкі «Мастацкая проза перыяду Айчыннай вайны» і рэцэнзіі: В. Агіевіча—«Юнацтва паэта», А. Зорына—«Поўдзень», А. Маслоўскага—«Неспакойны гарадок» і іншыя).

На яшчэ больш нізкім узроўні стаіць тэатральная крытыка. Артыкулы аб тэатральных пастаноўках і артыстах бедныя па зместу, напісаны саладжавай і вычварнай мовай. Яны не ўскрываюць характэрных памылак і недахопаў у рабоце нашых тэатраў, артыстаў і драматургаў і не мабілізуюць тэатральныя калектывы на палепшанне сваёй работы.

Хвалебная і павярхоўная крытыка не вучыць літаратараў і работнікаў мастацтва, не выхоўвае маладыя пісьменніцкія кадры, а, наадварот, супакойвае іх і параджае зазнайства. ЦК КП(б)Б лічыць, што крытыка часопіса «Беларусь», дадзеная ў артыкуле «Сумная проза і ўзнёслая крытыка», надрукаваным у газеце «Культура і жыццё» ад 10 жніўня 1946 года, з'яўляецца зусім правільнай і своечасовай.

ЦК КП(б)Б адзначае, што ўсе буйныя недахопы і памылкі, дапушчаныя часопісам «Беларусь», з'явіліся вынікам забыцця яго кіруючымі работнікамі таго палажэння ленінізма, што нашы часопісы—і навуковыя і мастацкія—служаць магутным сродкам нашай дзяржавы ў справе выхавання совецкіх людзей, асабліва моладзі, і таму павінны кіравацца тым, што складае жыццёвую аснову совецкага ладу, — яго палітыкай. Совецкі лад не можа цярпець выхавання моладзі ў духу абыякавасці да совецкай палітыкі, у духу наплявізма і безыдэйнасці.

Газета «Літаратура і Мастацтва» заняла няправільную пазіцыю ў адносінах да часопіса «Беларусь». Яна не дапамагла своечасова ўскрыць сур'ёзныя памылкі і недахопы ў яго рабоце, займалася незаслужаным, беспрынцыпным выхваленнем асобных твораў і артыкулаў, ухваляла няправільную лінію часопіса (артыкул М. Карпачова «Па старонках часопіса», «Літаратура і Мастацтва» за 30 красавіка 1946 года).

Рэдакцыйная калегія не ажыццяўляе калектыўнага кіраўніцтва часопісам, не збіраецца для абмеркавання прынцыповых пытанняў яго работы, многія яе члены ніякага ўдзелу ў рабоце часопіса не прымаюць.

Адказны рэдактар тав. Гурскі і рэдкалегія часопіса дрэнна спраўляюцца з сваімі абавязкамі, дапускаюць рад сур'ёзных палітычных памылак у кіраўніцтве часопісам, не праяўляюць большэвіцкай прынцыповасці і неабходнай патрабавальнасці ў ацэнцы якасці твораў, якія паступаюць у рэдакцыю, і слаба клапоцяцца аб забеспячэнні высокага ідэйнага і мастацкага ўзроўню апублікаваных у ім матэрыялаў.

ЦК КП(б) Беларусі абавязаў рэдакцыю часопіса «Беларусь» знішчыць паказаныя памылкі і недахопы і забяспечыць высокі ідэйны і мастацкі ўзровень часопіса, пашырыць яго тэматыку, шырока прапагандаваць новы пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР і БССР.

Вядучае месца на старонках часопіса павінны заняць мастацкія нарысы і апавяданні аб совецкіх людзях, наватарах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, на долю якіх выпала пачэсная задача будаўніцтва комуністычнага грамадства.

Публікуемыя матэрыялы і літаратурныя творы павінны пашыраць кругагляд чытачоў, узбройваць іх перадавымі ідэямі, выхоўваць працоўных у духу комуністычнай свядомасці, дапамагаць правільнаму выхаванню моладзі ў баявым і рэволюцыйным духу.

Часопіс, як і ўся наша перадавая совецкая літаратура, павінен адлюстроўваць і абараняць інтарэсы совецкага грамадства, совецкай дзяржавы.

Рэдакцыі часопіса «Беларусь» даручана распрацаваць, а аддзелу прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б разгледзець і зацвердзіць перспектыўны план работы часопіса з улікам указанняў гэтай пастановы.

Аддзелу прапаганды і агітацыі і аддзелу кадраў ЦК КП(б)Беларусі даручана ўмацаваць кіраўніцтва часопісам.



Адноўлены будынак Акадэміі навук БССР.

Фота Г. Вугаскі.

АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

ЯКУБ КОЛАС

Наша жыццё — няспынны рух наперад. Марксісцка-ленінская навука ляжыць у аснове грандыёзнай і многагранай дзейнасці па ўтварэнню новага чалавечага грамадства. Яна азначыла і акрэсліла тыя шляхі, якімі мы павінны ісці і ідзем да найвялікшага прагрэсу і росквіту нашай вялікай многанацыянальнай дзяржавы. Даволі кінуць самы абеглы погляд на пройдзены шлях, каб убачыць, колькі вялікіх і слаўных спраў зроблена нашым совецкім народам пад мудрым кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і нашага геніяльнага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. Вялікая Айчынная вайна, якая скончылася ўзяццем Чырвонай Арміяй Берліна, прадэманстравала перад усім светам магутнасць Совецкага Саюза, гераізм і маналітнасць яго народаў і жыццёвую сілу і праўду марксісцкай навукі, развітай Леніным і Сталіным. Вайна прычыніла нам цяжкія страты і глыбокія раны. Але як ні цяжкі страты, як ні глыбокі раны, вайна не затрымала нашага маладога, бурнага руху наперад у ясныя далі заўтрашніх дзён.

Ужо шмат часу прайшло са дня заканчэння вайны. Многа зроблена за гэты час у галіне аднаўлення нашай дзяржаўнай гаспадаркі, разбуранай вайною. Нашы народы, выхаваныя партыяй Леніна—Сталіна, ахоплены пафасам творчай працы і паказваюць узоры працоўнага гераізма. Прайшла і значная частка першага года чацвертай сталінскай пяцігодкі. Мы ведаем, якія велізарныя задачы стаяць перад намі для ператварэння ў жыццё грандыёзнай праграмы гэтай пяцігодкі. Мы павінны ў кароткі час заваяваць сабе першае месца ў свеце і ў галіне агульнага добрабыту працоўных, і ў галіне тэхнічнага ўдасканалення. Мы павінны пабудаваць комунізм у нашай краіне.

Веліч задач, пастаўленых чацвертай сталінскай пяцігодкай перад Саюзам Соцыялістычных Рэспублік у цэлым і перад кожным з нас у паасобку, патрабуе ад кожнага з нас мабілізацыі творчага духу і волі і ўсіх нашых інтэлектуальных сіл. Вось чаму кожны з нас, совецкіх людзей, на якім-бы вучастку мірнай працы ён ні стаяў, павінен арганізаваць свае сілы, дасканала ўзброіцца ідэйнай зброяй, якую дае нам наша комуністычная партыя і наш настаўнік таварыш Сталін. Таварыш Сталін кажа нам:

«Трэба прызнаць, як аксіому, што чым вышэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў любой галіны дзяржаўнай і партыйнай работы, тым вышэй і больш плённай будзе сама работа».

Тым-жа часам гэта аксіома не заўсёды з'яўляецца спадарожніцай у нашых справах і ўчынках. Заспакоенасць і адсутнасць палітычнай чуйнасці, прывялі да цэлага раду прарываў, што мелі і маюць месца на ідэалагічным фронце, у прыватнасці ў галіне мастацкай літаратуры, і далі магчымасць усплыць на паверхню такім літаратурным жужаліцам, чужым і варожым нам, як Зошчанка і Ахматава. Усім нам вядома пастанова Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў з поваду ленінградскіх часопісаў «Звезда і «Ленинград». Гэта пастанова ставіць паваротную веху ў гісторыі совецкай мастацкай літаратуры пасляваеннага часу. Яна датычыцца не толькі ленінградскага атраду совецкіх пісьменнікаў. Яна абавязкова для нас усіх. Яе павінны дасканала ведаць, памятаць і прыняць для кіраўніцтва ў сваёй літаратурнай дзейнасці ўсе пісьменніцкія арганізацыі братніх літаратур. У святле гэтай пастановы мы, беларускія паэты і пісьменнікі, павінны ўважна перагледзець нашы часопісы, усё напісанае намі за апошнія часы і адмесці ўсё наносное, недасканалае, малаважнае, безыдэйнае, як непатрэбны баласт.

Спынюся коратк на некаторых нашых беларускіх мастацкіх творах за апошні час. Я не стаўлю сабе задачы даць шырокі, разгорнуты агляд усяго, што намі напісана за пасляваенны час: зрабіць гэта ў невялікім артыкуле немагчыма. Я мушу пры гэтым заўважыць, што беларуская мастацкая літаратура часу Вялікай Айчыннай вайны стаяла ў першых радах совецкай літаратуры. Беларускім паэтам Аркадзем Куляшовым напісана адна з лепшых у Саюзе паэм на тэму аб вайне «Сцяг брыгады». Паэма адзначана Сталінскай прэміяй першай ступені. Нябожчык Янка Купала, які не дачакаў і не пабачыў шчаслівага і радаснага часу перамогі над лютым ворагам, даў цэлы рад твораў, напісаных моцна, па-купалаўску. Яго верш «Партызаны, партызаны, беларускія сыны» адыграў ролю магутнага артылерыйскага залпа ў справе разгрому ворага. Пятрусь Броўка напісаў зборнік лірычных вершаў, высока-ідэйных, актуальных, якія мабілізавалі наш народ на барацьбу і перамогу над фашысцкай Германіяй. Ім-жа напісана дасканалая паэма «Ясны кут». Яна ставіць сабою пераход ад вайны да актуальных праблем мірнага часу. Пятро Глебка, Максім Танк, Пімен Панчанка, а з імі рад другіх паэтаў унеслі сваю пачэсную даніну ў справу вызвалення нашай зямлі, часова занятай нямецкімі захопнікамі. Не адставала ў гэтай справе і творчасць нашых празаікаў. Нябожчык Кузьма Чорны напісаў цэлы рад высока-мастацкіх празаічных твораў і нарысаў на тэмы вайны. Такіх-жа твораў не мала напісаў і Міхась Лынькоў.

Але адгрымелі громы вайны. Была такая нагодка: «Калі грымяць гарматы, дык муза маўчыць». У нас-жа атрымалася адваротнае: наша муза прымоўкла якраз цяпер, калі громы вайны заціхлі, а мы ступілі на рэйкі творчай мірнай працы з яе неабсяжнымі перспектывамі. Гэта наша літаратурнае зацішша толькі зрэдку парушаецца нямногалікімі творамі і то не дужа шырокага грамадскага дыяпазону, хоць самі па сабе яны, бясспрэчна, дадатныя з'явы нашага сягоннешняга літаратурнага дня. З такіх твораў у паэзіі я магу назваць невялікую па аб'ёму паэму Петруся Броўкі «Хлеб», а ў прозе аповесць нашага маладога і таленавітага празаіка Усевалада Краўчанкі «Станаўленне». У гэтых творах ставяцца актуальныя праблемы аднаўлення краіны і праблемы творчай мірнай працы. Побач-жа з гэтым на старонках нашых часопісаў з'яўляюцца творы нізкай мастацкай якасці, творы пустыя і безыдэйныя, адарваныя ад нашага складанага, многагграннага кіпучага жыцця, дзе адбываецца тытанічная барацьба за ажыццяўленне новай грандыёзнай сталінскай пяцігодкі, калі такая-ж барацьба адбываецца і на міжнароднай арэне. Ніхто з нас, пісьменнікаў, да гэтага часу не даў твору, у якім-бы ва ўсёй паўнаце адбілася веліч подзвіга нашага народа ў партызанскай вайне. А дакументаў аб ёй і жывых яе ўдзельнікаў доўга шукаць не трэба. І наш пісьменніцкі абавязак — напісаць твор, варты нашага народа.

Перада мною два №№ часопіса «Беларусь», 3 і 7. У 3-м нумары надрукована апавяданне Антона Алешкі «Журба і Монцік». Перакажу змест апавядання. Два дэмабілізаваныя чырвонаармейцы — Журба і Монцік. Яны з адной вёскі на Случчыне, выпадкам сустрэліся ў Нямеччыне пасля доўгіх гадоў вайны. Землякі разгаварыліся. Журба — баявы салдат Чырвонай Арміі. На яго грудзях тры ордэны: «Слава», «Чырвоная Звязда» і ордэн Айчыннай вайны. Ён прайшоў Буг, Віслу, Одэр. Многа разоў быў паранены. У Монціка медаляў не было, хоць ён і хваліцца земляку, што ордэны ёсць, але ён проста не начапіў іх. Монцік туляўся ад вайны і быў на фронце пастухом, а земляку сказаў, што быў у авіяцыі. У мінулым, да вайны, у землякоў быў канфлікт з-за дзяўчыны. Монцік аблюбаваў сабе Вольку Рымараву. На сяле ўжо лічылі, што Волька будзе жонкаю Монціка, але, як кажа аўтар: «Яшчэ ўлетку Рымарава Волька падмігнула вокам Мікіце (Журбе), а на другую зіму яна вышла замуж за яго». Монцік напіўся з гора і прышоў няпрошаны на вяселле, каб знясла віць маладога, і пачаў буяніць і нават разбіў дзве талеркі. Яго вывелі з хаты і перакінулі праз частакол на сметнік. З гэтага часу Монцік затаіў злосць на Журбу і цяпер, калі яны сустрэліся, каб разам ехаць у сваё сяло, гэтая злосць зноў ачнулася ў Монціка. Ля Буга Журба сышоў з поезда, каб пабачыць дзяўчыну, якая ўратавала яму, цяжка ранеламу, жыццё. Монцік адзін паехаў у сяло да свае жонкі і рашыў адпомсціць Журбе, падставіць яму палку, ды сукаватую. Расказаўшы аднавяскоўцам, як ён штурмаваў Берлін, Монцік упамянуў і пра Журбу, з якім ён ехаў. Дачуўшыся аб гэтым, Волька пайшла да Монціка распытаць пра мужа. А Монцік ёй сказаў: «Э, мілая, не бачыць табе Мікіты. Я з ім разам нават Буг пераехаў, але ён злез і пайшоў да свае каханай. У вайну знайшоў ужо сабе другую. Казаў, завецца Зосяй». Волька гаравала. Вечарам да яе прышоў п'яны Монцік і стаў прызнавацца ёй у каханні і прыставаць да яе. Волька выгнала яго вон і расказала пра яго паводзіны жонцы. Назаўтра прыехаў Журба і цэлы дзень расказваў аднавяскоўцам аб вайне, а потым з Волькаю прыступіў да рамонту будынка. А ў гэты час жонка Монціка гнала мужа вон: «Ты мне такі не патрэбен, ідзі!». І Монцік пайшоў. Журба паглядзеў на Монціка і спытаў: «Што, браце, упрочкі ідзеш?» Монцік нічога не адказаў, угнуў галаву і пакрочыў з сяла. Вось і ўсё апавяданне і ўсе праблемы, якія паставіў і вырашыў мастацкім словам Антон Алешка.

У 7-м нумары таго-ж часопіса змешчана апавяданне Усевалада Краўчанкі пад назваю «Чэрвень». Напісана апавяданне з літаратурнага боку шмат лепей, чым апавяданне Антона Алешкі. Але ідэйная вартасць і гэтага апавядання стаіць таксама на невысокім узроўні. Усё апавяданне ад пачатку да канца падпарадкавана аднаму матыву — вузка асабістаму пачуццю кахання. Тым-жа часам у апавяданні ёсць моманты, якія, калі-б іх развіў аўтар і здолеў падняць на ўзровень грамадскіх матываў, то апавяданне толькі выйграла-б. Аднак, аўтар не зрабіў гэтага. Наадварот, ён пастараўся затушаваць іх і кінуць на іх цень. Ад гэтага апавяданне атрымалася не дужа высокай мастацкай якасці.

Апавяданне вядзецца ад імя аўтара. Яго прыяцель Данік угаварвае ехаць на Днепр у Крушынаўку, на тое месца, дзе Данік у час вайны вёў са сваім батальёнам бой за пераправу, дзе кожная пядзя зямлі была апалена агнём вайны. Калі Данік прыгадваў памятны для яго бой за пераправу, то — піша аўтар — «каля губ на яго твары паяўляліся глыбокія маршчыны, ён ажно станавіўся пастарэлым і непрыгожым». І тут-жа аўтар лёгкадумна дадае: «Я не хацеў слухаць яго гэтыя ўспаміны і папярэджваў, што калі ён мае сабе ў галаве, каб якая-небудзь дзяўчына ў свеце палюбіла яго, то няхай ён лепш не ўспамінае пры ёй гэтай пераправы». Такім чынам, гераічны ўчынак байцоў Чырвонай Арміі аўтар абарачвае ў пошлы, недарэчны жарт. Аўтару ехаць не хочацца — ён чакае ад сваёй каханай дзяўчыны тэлеграму з умоўленым паролем: «Уладзік, сонца ўстала». Гэта азначала, што, калі тэлеграма з такім паролем прыдзе, то дзяўчына будзе яго. Данік катэгарычна паставіў умову, што калі яго прыяцель не паедзе з ім, дык ён паедзе адзін, але затое не будзе лічыць Уладзіка сваім другам. Аўтару давялося скарыцца. Яны селі ў човен. А плысці трэба было 30 кілометраў уверх па Дняпры. На павароце іх абганяў параход з баржамі. Яны прычапіліся да баржы і хутка даплылі да месца, дзе ў 1943 годзе вёўся бой за пераправу. Агледзелі месца бою. Данік падрабязна расказваў аб кожнай дэталі, якія жылі яшчэ ў яго памяці. Але раптам у паводзінах Даніка адбылася змена. Ён перастаў цікавіцца месцам бою і рознымі хітрыкамі павёў аўтара ў Крушынаўку. Аўтар здагадаўся, што не месца бою цягнула сюды Даніка, а нешта іншае і, каб не замінаць яму, пакінуў яго. Данік пашоў у хату аднаго двара і забавіўся там. А калі аўтар зайшоў у той двор і стаў падглядваць праз шчыліны густых шчыкецін агарожы, то ён убачыў Даніка, а з ім прыгожую дзяўчыну. Нарэшце, Данік пазнаёміў прыяцеля з дзяўчынай і сказаў: «Уладзік, ты можаш павіншаваць мяне. Я знайшоў дзяўчыну, якая ўратавала мне, параненаму, жыццё пасля таго бою на пятачку. І мы хутка з ёю пажэнімся». Пад вечар шчаслівы Данік і засумаваўшы і зайздросціўшы яму аўтар паехалі дамоў. А дома, яшчэ не паспеў ён вылезці з чаўна, яго чакаў прыемны сюрпрыз — прышла тэлеграма: «Уладзік, сонца ўстала». Уладзік прышоў у такі цялячы экстаз, што тут-жа з чаўна бухнуўся ў Днепр і паплыў на другі бераг пад той дуб, дзе яго чакала прыслаўшая тэлеграму дзяўчына. Як ён там у мокрым адзенні заляцаўся з каханаю дзяўчынаю — аўтар не гаворыць нам.

«Такі быў у нас з Данікам шчаслівы чэрвень» — заканчвае сваё апавяданне аўтар.

Да гэтага несур'ёзнага, непрадуманага апавядання трэба яшчэ дадаць, што ў ім наглядаюцца стылёвыя няўвязкі і ненатуральнасці. Незразумела, напрыклад, чаго Данік так цягне ў Крушынаўку аўтара, калі той толькі замінае яму ў пошуках дзяўчыны. Навошта было плысці уверх па Дняпры чоўнам за трыццаць кілометраў, калі там хадзілі параходы. Таксама незразумела, як магла дзяўчына, якая жыла ў далёкім горадзе, абагнаць тэлеграму і апынуцца каля дуба раней, чым тэлеграма ў руках Уладзіка. Усё гэта разам узятае і прыводзіць да няспеласці і лёгкаважнасці самога апавядання.

Не будзем утойваць сваіх грахоў. Пасіўнасць, замкнёнасць у вузкім коле дробных інтарэсаў і ў сваёй шкарлупіне, адрыў ад жывых крыніц жыцця, ад народа ў шырокім сэнсе гэтага слова, прытупленне палітычнай чуйнасці і назіральнасці, а часамі і несур'ёзныя адносіны да свае ролі пісьменніка-грамадзяніна, пісьменніка-барацьбіта за нашы высокія грамадскія ідэалы, адсутнасць сапраўднай работы над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню і пісьменніцкай кваліфікацыі, боязнь крытыкі і самакрытыкі,—усё гэта недахопы, ад якіх не ўсе мы пазбаўлены. Гэтыя недахопы і прыводзяць да зніжэння мастацкай творчасці. На шчасце, такія з'явы не маюць агульнага характару, але яны бытуюць у нашым асяроддзі сярод некаторых з нас. Інакш чым, як не гэтымі грахамі, растлумачыць з'яўленне такіх вершаў, як змешчаны ў адной абласной газеце верш Анатоля Астрэйкі, дзе ён гаворыць пра пшано, што расце на полі і пра сіні лапавухі, як конь, авёс. Спынюся яшчэ на пары вершаў нашых двух маладых і таленавітых паэтаў: Максіма Танка і Пімена Панчанкі. Вершы змешчаны ў тым-жа 7-м № «Беларусі». Не скажу, што гэта вершы слабыя. Наадварот, з боку паэтычнага майстэрства іх можна пахваліць. Я не хачу ўчыняць і ганення над імі. Няхай яны займуць сваё месца ў зборніках твораў паэтаў, але ў часопісах, разлічаных на масавага чытача, змяшчаць іх не варта. Вось верш Танка «Апала зорка».

«Апала зорка, і на міг
Здалося мне, што недзе ты
Сярод сузор'яў залатых
Мігнула ў трыснік густы.
Я ў човен кінуў два вяслы,
Бярэмя снасцяў рыбака
І, узняўшы ветразі, паплыў
Цябе і клікаць і шукаць.
Але на гладзі вадзяной,
Аж пад крутыя берагі
Убачыў я перад сабой
Адны кругі, адны кругі».

І болей нічога не ўбачыў пясняр.

Нотка безнадзейнасці, песімізму і ўпадніцтва гучыць у гэтым вершы. А нам гэтага не трэба; мы ў пачатку вялікай дарогі аднаўлення, перад намі шырокія далі. У нас ёсць сілы прыйсці да гэтых даляў, і няма нам падставы ўпадаць у безнадзейнасць.

Пімен Панчанка як-бы ўторыць Танку, але ў другім складзе:

«Я тэмы для вершаў старанна вышукваў,
Пра шчасце людское я хітра выпытваў,
Слухмянымі рыфмамі звонка выстукваў
Пра гора і радасць, пра грозныя бітвы.
І мне ўяўлялася слова памацаў я,
Што сцежку пасцеле пад ногі пракора—
І рынуцца зоры і сэрцы юнацкія
У маё неспакойнае сіняе вока.
І раптам вось гэта аднекуль нахлынула
Такая туга, такая самоцішча,
Што станеш наўмысля пад цёмнымі ліўнямі,
І не, не крануць, анічуць не замочышся».

І далей Панчанка гаворыць пра сваю нязмерную тугу. Але яму больш пашчасціла, чым Танку: Танк нічога не знайшоў, апроч кругоў на вадзе. А Панчанка заспакоіўся: ён утапіў свой сум у вачах дзяўчыны, і яму стала зноў весела і радасна.

«Са мною ты побач. Сусвет заспакоены,
І зноўку нам добра, так шчыра навокал,
І зноўку вясёлай зарою напоена
Маё неспакойнае сіняе вока».

Не ўдаючыся ў далейшыя каментары, я хачу прыгадаць нашым паэтам запаветныя словы баяна беларускага народа, Янкі Купалы аб тым, якія патрэбны нам песні.

«Трэба нам песень, якія спяваў-бы,
Гонячы трактар, калгаснік вясёлы,
Калгасніца, полючы буйныя грады,
Спявалі-б калгасныя вёскі і сёлы.
Трэба нам песень, шчырых і чулых,
Што праўду дзён нашых ад полюсаў неслі-б
І славу вякоў, пакаленняў мінулых
Сваёй перамогай геройскай устрэслі».

У заключэнне некалькі слоў аб гісторыі беларускай літаратуры. Нашы школы адчуваюць вострую патрэбу ў падручніку па гісторыі беларускай літаратуры. Ужо даўно рабіліся спробы напісаць такі падручнік. Ён быў напісаны, але пабачыць свету яму не давялося. Рукапісы загінулі ў час вайны, і ніякіх слядоў ад іх не засталося. Цяпер ізноў распачата работа па напісанню такой кнігі. Над ёю працуе калектыў нашых гісторыкаў літаратуры. У асноўным работа па складанню падручніка закончана. Цяпер яна праходзіць сваю перадапошнюю стадыю. Яе чытаюць рэдактары. Не ўсе артыкулы, напісаныя для падручніка, маюць аднолькавую вартасць. А некаторыя з іх патрабуюць карэннай перапрацоўкі. У іх ёсць цэлы рад вельмі значных недахопаў і палітычных памылак. Я маю на ўвазе артыкулы, напісаныя тав. Ларчанкам. Неразуменне ці няўважлівыя адносіны да ленінскага вучэння аб існаванні дзвюх нацыянальных культур у кожнай нацыянальнай культуры прыводзіць аўтара да некрытычных адносін і схілення перад кожным беларускім пісьменнікам мінулага незалежна ад яго ідэйных пазіцый, мастацкай і грамадскай вартасці яго творчасці. Так, усе пісьменнікі XIX і XX вв. падаюцца, як барацьбіты за нацыянальнае вызваленне Беларусі. Пісьменнікаў розных ідэалагічных кірункаў і прадстаўнікоў розных сацыяльных катэгорый Ларчанка залічае ў адзін ідэйны лагер: народнік Багушэвіч, лібералы Чачот, Баршчэўскі, М. Косіч, рэакцыянер Ельскі. Адгэтуль аўтар робіць няправільны вывад, што ўся беларуская літаратура XIX ст. глыбока народная. Але як можна прызнаць народнікам Ельскага, якога Ларчанка называе асветнікам і гуманістам? Вось як гэты «народнік», «гуманіст» і «асветнік» навучае народ: «Бог сам прызначыў падзел людзей. Ні сілай, ні здароўем, ні векам, ні маёнткам, ні ўласнасцю не будуць людзі роўныя, бо гэта прызначыў сам бог». Таксама нічога не сказаў Ларчанка і пра «народалюбства» Косіч, якая пісала аб беларускім народзе ў пагардлівым і абразлівым тоне і давала яму самую адмоўную характарыстыку. Але Ларчанка не бачыць гэтага. Ён імкнецца стварыць такі літаратурны рай у мінулым, дзе ўсе пісьменнікі любяць беларускі народ, дбаюць аб ім, дзе ўсё «тишь да гладь, да божья благодать». Каб вытрымаць да канца свой стыль, Ларчанка з такой-жа ўстаноўкай падыходзіць і да ацэнкі «Нашай Долі» і «Нашай Нівы» і тых пісьменнікаў, якія гуртаваліся вакол «Нашай Нівы», не робячы ніякай ідэалагічнай дыферэнцыяцыі паміж імі. Не ладна атрымалася ў Ларчанкі і з Алесем Гаруном, якога ён паказвае, як «вялікага патрыёта свае радзімы». Але які-ж патрыёт свае радзімы будзе вітаць ворага беларускага народа, пана Пілсудскага і дзякаваць яго за вызваленне ад «большэвіцкай няволі»?

Некрытычнасць, няўдумлівасць, няведанне ці забыццё марксісцка-ленінскай навукі аб законах развіцця грамадства прыводзяць Ларчанку да грубых памылак ідэйна-палітычнага характару. Яму трэба крытычна паставіцца да іх, пазбыць іх і даваць прадукцыю высокай ідэйнай і навуковай якасці.

Задачы драматургаў і дзеячоў тэатральнага мастацтва

У сваім дакладзе аб часопісах «Звезда» і «Ленинград» таварыш Жданаў гаварыў: «Вядома, наша літаратура, якая адлюстроўвае лад больш высокі, чым любы буржуазна-дэмакратычны лад, культуру ў шмат разоў больш высокую, чым буржуазная культура, мае права на тое, каб навучаць іншых новай агульначалавечай маралі. Дзе вы знойдзеце такі народ і такую краіну, як у нас? Дзе вы знойдзеце такія цудоўныя якасці людзей, якія выявіў наш совецкі народ у Вялікай Айчыннай вайне і якія ён кожны дзень выяўляе ў працоўных справах, перайшоўшы да мірнага развіцця і аднаўлення гаспадаркі і культуры. Кожны дзень узнімае наш народ усё вышэй і вышэй. Мы сёння не тыя, што былі ўчора, і заўтра будзем не тыя, што былі сёння. Мы ўжо не тыя рускія, якімі былі да 1917 года, і Русь у нас ужо не тая, і характар у нас не той. Мы змяніліся і выраслі разам з тымі навейшымі пераўтварэннямі, якія ў корані змянілі аблічча нашай краіны».

Гэтыя велізарныя пераўтварэнні, якія штодня адбываюцца ў нашай краіне, змяняючы аблічча совецкага чалавека, павінны быць аб'ектам глыбокага вывучэння дзеячоў нашай літаратуры і мастацтва.

Вялікія задачы паўстаюць перад совецкімі драматургамі і работнікамі совецкага тэатра.

Вядома, што асноўны канфлікт старой дарэволюцыйнай драматургіі будаваўся на супярэчнасцях людзей уласніцкага свету. Барацьба паміж драпежнікамі рознай велічыні складала яго сутнасць, а грошы—яго галоўны рухавік. Нездарма Бомаршэ сказаў: «грошы з'яўляюцца нідцю інтрыгі». У капіталістычным грамадстве ўсё было прадажным: сумленне, любоў, перакананні.

Часта ў старой драме выступала барацьба адзінкі, якую не разумелі навакольныя, супроць тагочаснага грамадства. Сумленныя людзі, іх каханне, надзеі гінулі ва ўласніцкім свеце—свеце прадажным і ліхварным. Старая класічная драматургія пакінула нам у спадчыну велізарнейшую галярэю яскравых вобразаў і характараўтыпаў—тут і адзінокія няўдачнікі, і сумленныя дзівакі, і старыя разбэшчаныя ліхвяры, і маладыя коршуны, і дамы вышэйшага свету, і г. д., і г. д.

Справа ў тым, што гэта велізарнейшая галярэя яскравейшых вобразаў уплывае на свядомасць нашых драматургаў і дзеячоў тэатра нават тады, калі яны бяруцца за паказ людзей новага свету. І яны, нярэдка бессвядома, пераносяць асобныя рысы гэтых людзей на людзей нашага грамадства.

А між тым, зусім ясна, што совецкія людзі з'яўляюцца людзьмі новай эпохі, зусім адменнай і процілежнай буржуазна-капіталістычнай эпосе. Наш народ загартаваўся ў агні рэвалюцыі, у змаганні з іншаземнымі нашэсцямі і нападамі. І хоць ён не адмаўляецца ад культурных традыцый мінулага, крытычна засвойвае іх, усё-ж з'яўляецца ўжо не тым народам, а іншым, народам новай социялістычнай эпохі.

Як-жа можна веліч спраў людзей новага свету, якія будуюць комуністычнае грамадства, выявіць праз старыя канфлікты, што былі прыгодны старой драматургіі? А між тым, некаторыя нашы драматургі, рэжысёры і акторы знаходзяцца яшчэ ў палоне старых прыёмаў, якія часамі ператвараюцца ў штамп. Перавага дэдэктыва ў выражэнні канфлікта, або такія прыёмы фабулы, як неапраўданыя ходам падзей падслуханая размова, пераапрананне, згублены ліст, становяцца малапрыгодным пры паказе сучаснасці.

А колькі штампаў развялося ў нас у драматургіі і на сцэне. Дзівак прафесар; малады бадзёры прастак; герой, які з'яўляецца шэрым рупарам аўтарскіх сентэнцый; у нас у Беларусі: мудры дзядок; калгаснік з прымаўкай, які больш падобны на шляхціца з старых вадэвіляў, чым на калгасніка; нявеста, якая ў фальклорнай песні шукае адказу на свае пачуцці,—усё гэта паўтараецца вельмі часта. Ні чым іншым, як дрэннай традыцыяй і штампам можна растлумачыць безліч атрут і смярцей у некаторых гістарычных п'есах. Нашы рэжысёры і акторы маюць ужо пэўны набор штампаваных прыёмаў, пры дапамозе якіх імкнуцца паказаць совецкіх людзей. Калі-ж ім трапляюцца ў п'есе людзі жывыя, поўнакроўныя, адменнага новага характару, тэатральныя дзеячы губляюцца, не могучы выявіць іх сутнасці.

З другога боку ёсць такія тэарэтыкі сярод нашых драматургаў і крытыкаў, якія сцвярджаюць, што ў нашых совецкіх п'есах не можа быць ніякіх канфліктаў, а людзі павінны быць пазбаўлены яркіх рыс характару. Наша грамадства не мае антаганістычных класаў—значыць не можа быць вострых канфліктаў у п'есах,—сцвярджаюць яны. Такім чынам, гэтыя тэарэтыкі ваюють за бесканфліктную драматургію.

Але бесканфліктнай драматургіі існаваць не можа.

Гэтыя тэарэтыкі з ліку крытыкаў і драматургаў забываюць, што ў нашай краіне існуюць супярэчнасці росту, руху наперад.

Пра гэта таварыш Жданаў гаворыць: «Мы сёння не тыя, што былі ўчора, а заўтра будзем не тыя, што былі сёння».

Такім чынам барацьба за рух наперад, за дасягненне ўсё новых і новых вышынь,—з'яўляецца асновай канфлікта, які можа бытаваць у адным чалавеку і паміж людзьмі ў нашым грамадстве. Акрамя таго ў свядомасці нашых людзей ёсць рэшткі капіталізма. За іх выкараненне мы павінны змагацца. Таварыш Жданаў гаворыць:

«Мы павінны паказаць у той-жа час нашым людзям, якімі яны не павінны быць, павінны бічаваць перажыткі ўчарашняга дня, перажыткі, якія перашкаджаюць совецкім людзям ісці наперад».

Такім чынам, ёсць вялікія мажлівасці для разгортвання сатырычнага жанра, для паказа ў драматургічных творах людзей рознага характару і паводзін, для выяўлення канфлікта паміж імі.

У цэнтры нашай увагі павінен быць чалавек сталінскай эпохі—мудры, разумны, адукаваны, чалавек глыбокага інтэлекту і вялікага сэрца.

Гэты чалавек вынес на сваіх плячах асноўны цяжар мінулай вайны, ён і цяпер робіць выключныя працоўныя подзвігі, набліжаючы дзень поўнай перамогі комунізма.

Чалавек сталінскай эпохі, на прыкладзе якога будзе выхоўвацца маладое пакаленне, павінен стаць нашым галоўным і ўлюбёным героем. Тады мы выканаем задачу, якую паставіў перад намі таварыш Жданаў:

«Паказаць гэтыя новыя высокія якасці совецкіх людзей, паказаць наш народ не толькі ў яго сённешні дзень, але і зазірнуць у яго заўтрашні дзень, дапамагчы асвятліць пражэктарам шлях наперад—такая задача кожнага добрасумленнага совецкага пісьменніка. Пісьменнік не можа цягнуцца ў хвасце падзей, ён абавязаны ісці ў перадавых радах народа, паказваючы народу шлях яго развіцця.

... Совецкія пісьменнікі павінны дапамагчы народу, дзяржаве, партыі выхаваць нашу моладзь бадзёрай, якая-б верыла ў свае сілы, не баялася ніякіх цяжкасцей».

СУЧАСНАСЦЬ—ПЕРШ ЗА ЎСЁ

На працягу трох дзён з 18 па 20 лістапада ў Маскве адбывалася Усесаюзная нарада тэатральных дзеячоў і драматургаў.

На нарадзе былі заслуханы даклады Начальніка Галоўнага Ўпраўлення тэатраў Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР Ю. С. Калашнікава аб рабоце драматургаў і тэатраў па стварэнню сучаснага совецкага рэпертуара, К. М. Сіманава і П. А. Маркаўа аб новых творах совецкай драматургіі 1946 года, мастацкага кіраўніка маскоўскага тэатра імя Ленінскага комсамола І. Н. Бярсенева, дырэктара Украінскага Акадэмічнага тэатра імя Івана Франко Г. П. Юра і мастацкага кіраўніка Грузінскага Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Руставелі А. А. Васадзе аб сумеснай рабоце тэатраў з драматургамі. У дакладах было адзначана, што пасля пастановы ЦК ВКП(б) ад 26 жніўня г. г. «Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнню» была праведзена значная работа па ачышчэнню рэпертуара нашых тэатраў ад п'ес, якія паклёпнічалі на совецкіх людзей, ад п'ес нізкага ідэйнага і мастацкага ўзроўню, а таксама нізкапробных твораў заходняга рэпертуара. Нашы тэатры аказаліся даволі густа засмечанымі такімі п'есамі. Сучасныя совецкія п'есы цяпер становяцца галоўнымі ў рэпертуары нашых тэатраў. П'есы Л. Малюгіна «Старыя сябры», А. Сурава «Далёка ад Сталінграда», Б. Лаўрэнёва «За тых, хто ў тылы», а таксама творы А. Карнейчука, К. Сіманава і другіх ідуць у дзесятках тэатраў Совецкага Саюза.

Значныя поспехі дасягнуты ў рабоце тэатраў з драматургамі. Многія тэатры здолелі прыцягнуць да стварэння п'ес маладых аўтараў, або пісьменнікаў другіх жанраў—паэтаў, празаікаў, журналістаў. У бліжэйшы час будуць пастаўлены новыя п'есы К. Сіманава «Жыццё пытанне» і «Дні і ночы», А. Карнейчука «Прыязджайце ў Званкавое» і «Мара» (пераапрацаваная нанава), Барыса Гарбатава «Закон зімоўкі», п'еса Папова пра маладыя гады Ільіча, Валянціна Катаева «Час наперад!». Аляксандра Крона «Другое дыханне», Владзіміра Салаўёва, «Дарога перамог».

У спрэчках, якія разгарнуліся на нарадзе, бралі ўдзел: старшыня Камітэта па справах Мастацтва пры Совеце Міністраў СССР М. Б. Храпчанка, дзеячы мастацтва А. Яблачкіна, С. Міхоэлс, Ю. Завадскі, крытыкі Ю. Юзоўскі, Г. Штайн, Г. Баяджыяў, драматургі А. Карнейчук, Л. Малюгін, Б. Чырскоў, В. Салаўёў, начальнік Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў Беларускай ССР тав. П. Лютаровіч, начальнік Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў РСФСР Н. Беспалаў, дзеячы мастацтва Армянскай, Азербайджанскай, Літоўскай, Латышскай і іншых рэспублік.

Тры асноўныя пытанні горача дыскутаваліся на нарадзе: аб канфлікце ў сучаснай драматургіі, аб формах і метадах сумеснай работы драматургаў з тэатрам і аб тэатральнай крытыцы. Т. т. М. Храпчанка, П. Маркаў, Ю. Юзоўскі, Б. Чырскоў гаварылі аб новай прыродзе драматычных канфліктаў, якія павінны быць у совецкіх п'есах. Тут трэба ўлічваць, што наша грамадства пазбаўлена антаганістычных класаў, што ў нас у рэчаіснасці існуе галоўны канфлікт: паміж перажыткамі старога і новымі з'явамі, канфлікт росту, развіцця, удасканалення. Яны завастрылі ўвагу на неабходнасці змагання супроць штампа, які часта ўжываецца рэжысёрамі і акторамі пры стварэнні вобраза сучаснага чалавека.

Л. Малюгін у сваім выступленні звярнуў увагу на кароткі тэрмін жыцця некаторых сучасных п'ес.

— Гэта вынікае,—гаворыць Малюгін,—з ніякага інтэлектуальнага ўзроўню герояў. Нам трэба зрабіць больш працяглым тэрмін жыцця нашых п'ес, а гэта будзе дасягнута толькі тады, калі інтэлектуальны ўзровень героя будзе больш высокі, калі думкі, якія ён выказвае, будуць настолькі цікавыя, што здолеюць доўгі час хваляваць гледача.

У спрэчках аб рабоце тэатраў з драматургамі былі выказаны супроцьлеглыя думкі. Калі адны лічаць, што драматург павінен прыносіць у тэатр абавязкова завершаную да канца п'есу, дык другія трымаюцца тае думкі, што п'еса ёсць калектыўны твор аўтара і тэатра і павінна, па сутнасці, стварацца ў тэатры.

Аднак, правільна гаварылася аб тым, што ўсё залежыць ад таленту, мажлівасці і вопыту драматурга. Калі ён здольны сам цалкам завяршыць свой твор—вельмі добра, але нічога хібнага няма ў тым, калі пачынаючаму драматургу дапаможа тэатр, толькі каб ён яго не збіваў на штампованыя тэатральныя прыёмы.

Вельмі гарачымі былі спрэчкі аб тэатральнай крытыцы. Некаторыя дакладчыкі раілі крытыкам выязджаць у творчыя камандыроўкі на тыя аб'екты, пра якія напісана п'еса, каб крытыкаваць яе з пазіцый жыцця.

Аднак, як правільна было адзначана, гэткія камандыроўкі яшчэ не дадуць крытыку правільнага ключа да разумення твора. Безумоўна, і крытыку трэба вывучаць жыццё, але нельга забываць на ўзброенасць крытыка тэорыяй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна і разумення закананамернасці ў развіцці рэчаіснасці.

Нарада прайшла пад знакам змагання за партыйнасць драматургіі, за ідэйную глыбіню, за ўключэнне драматургаў і тэатральных дзеячоў у барацьбу за выкананне надзённых задач, пастаўленых 4-ай сталінскай пяцігодкай.

Да пятай гадавіны з дня смерці Змітрака Бядулі

ПЯСНЯР НАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ

Бядуля прыйшоў у беларускую літаратуру ў гады рэакцыі, якая надыйшла пасля рэволюцыйнага ўздыму 1905 г.

У 1910 г., калі яму было 24 гады, ён надрукаваў у газеце «Наша ніва» свой першы верш «Начлежнікі пяюць». Малады пісьменнік прынёс у літаратуру скарб сваёй чулай паэтычнай душы, прагнай да неусвядомленых яшчэ, але высокародных спраў на карысць пакутнага народа.

У душы паэта пераважалі тады вялікі смутак і востры боль, але не было ні адчаю асуджаных гісторыяй класаў, ні туманнай містыкі сімвалістаў. Проста не было падстаў да радасці і смеху, калі навокал чуліся плач і стогны. Душная атмасфера рэакцыі прыціскала непамерным цяжарам, і юнак-паэт выразна не ведаў, куды ісці і што рабіць? Гэтак ён і піша ў адным з сваіх ранніх вершаў «Гараць сняжынкі кволыя»:

Вільготнаю лучынаю
Дымяць мае гады.
А дзверы ўсе зачынены,
Куды ісці, куды?

Часам душа жадае «чагосьці новага»; прыходзіць няяснае ўсведамленне, што трэба пакінуць мары—небыццё, і перайсці да рэальнага жыцця, да змагання за лепшую будучыню. Але паасобныя імпульсы, няясныя парыванні паэта пакуль што не прыводзілі яго да ўсведамлення шырокай гістарычнай перспектывы.

Ён звяртаецца да свайго «я», прабуючы знайсці адказ на загадкі жыцця. У 1913 г. выходзяць з друку «Абразкі» — зборнік імпрэсій, што ўяўляюць сабой размову паэта сам-на-сам, ланцуг псіхалагічных малюнкаў ці інтымных перажыванняў аўтара.

З надзвычайнай дакладнасцю фіксуюцца тут нават ледзь улоўныя вібрацыі душы, розныя адценні настрояў і пачуццяў, афарбаваных звычайна ў мінорныя тоны. Паэт скардзіцца на пакутлівую нуду, сум і боль. Думы не даюць яму супакою, яго то мучыць адзінота, то хочацца застацца аднаму. Нешта таемнае гаворыць яму вячэрняя зорка, і ўяўленне малюе ў цёмным хмызе русалак з доўгімі валасамі. Мара, казка бярэ верх над рэальным жыццём. Так і здаецца аўтару «Абразкоў», што «песні маюць уладарнасць над жыццём» і што «толькі дзеля казак трэба жыць на свеце...».

Адыход Бядулі ў свет суб'ектыўных настрояў, абсалютызаванне свайго «я»—маглі зрабіцца для яго вельмі сур'ёзнай пагрозай адрыву ад рэальнай глебы, пагрозай, якая асуджала-б паэта на бясконцае рэфлексаванне. Але Бядуля не застаўся наіўным лятуценнікам, ён таксама не зрабіўся ні эстэтам-гурманам, ні пасіўным сузіральнікам, які з вышыні «вежы з слановай касці» глядзіць на свет і на людзей з горкай, скептычнай усмешкай.

У «Абразках» ён вызваляецца ад юнацкіх наіўна-рамантычных настрояў, каб стаць крыху пазней ужо назаўсёды на шлях рэалізма. Тое, што там сустракаецца як выключэнне (апавяданне «Пастушка» цалкам рэалістычнае па свайму кірунку), у далейшым робіцца асноўным творчым метадам пісьменніка.

Здаровая народная стыхія, будні звычайных людзей працы—сяляк, лесарубаў, возчыкаў, рыбакоў, — уладарна прыцягваюць да сябе ўвагу З. Бядулі, даючы яму безліч розных уражанняў і матэрыял для наступных малюнкаў побыту і нораваў людзей. Гэтыя з'явы жыцця выклікалі патрэбнасць іх асэнсавання і прыводзілі да вываду аб існаванні страшэннай сацыяльнай несправядлівасці.

Без усялякага прыхарошвання Бядуля пачаў маляваць беднасць і гаротнасць беларускай перадрэволюцыйнай вёскі. Так з'явіліся яго кароткія і сціплыя, надзвычайна выразныя, па-майстэрску напісаныя навелы. Імкнучыся ўведаць псіхалогію «маленькіх», прыгнечаных людзей, ён на паасобных, нават нязначных бытавых эпізодах раскрывае вялікую трагедыю працоўнага чалавека, які ва ўмовах капіталізма марнее, б'ецца, як рыба аб лёд, у пошуках выйсця з «зачаравонага кола жыцця», пакуль не пазнае адзіны шлях да шчасця—шлях барацьбы. Бядуля стаўіцца з вялікай любоўю да герояў сваіх апавяданняў, горача спачувае іх гору і пакутам. Яго рэалістычныя замалёўкі, у аснове якіх ляжаць вялікія гуманістычныя ідэі, дзякуючы глыбокай пранікнёнасці ў сутнасць з'яў жыцця, — набываюць значэнне рэчаў з сапраўды-філасофскімі абагульненнямі.

Вось невялікае апавяданне «Пяць лыжак заціркі». Што можа быць прасцей?

Але якой сумнай гіроніяй гучаць абагульняючыя радкі аўтара: «Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце...».

Такім самым балючым пачуццём прасякнуты апавяданні, якія малююць старасць працавітага селяніна, вымушанага пад канец жыцця ісці жабраваць і цярпець знявагі ад уласных дзяцей («Летапісцы», «Умарыўся»). У няшчасных, бедных вёсках страшэнныя з'явы адбываюцца кожны дзень і кожную гадзіну. Згубіўшы ўсялякую надзею на лепшае жыццё, селянін спаганяе сваю злосць на беднай, змучанай працай і недаяданнем жонцы, міжвольна робіцца прычынай яе дачаснай смерці («Сымон»). Страх перад галоднай смерцю прымушае жыхароў цэлых вёсак рабіць жабрацтва сваёй прафесіяй («Ашчаслівіла»); гэты-ж страх штурхае сумленнага селяніна на зладзейства («Сорам»).

Усе лепшыя апавяданні Бядулі («Сон старога Анупрэя», «Гора ўдавы Сымоніхі», «Маленькія дрывасекі», «Дванаццацігоднікі», «На каляды к сыну», і г. д.) характарызуюцца такой-жа сацыяльнай завостранасцю тэмы. Некаторыя з іх быццам адзначаны пячаткай імпрэсіяністычнай задуменнасці; у другіх, на першы погляд, няма выразнай сацыяльнай тэндэнцыі. Але і пад вонкавай імпрэсіяністычнай афарбоўкай у творах Бядулі захавана магутная сіла пратэста супроць носьбітаў сацыяльнага зла.

Рад буйнейшых твораў пісьменніка прысвечаны паказу актыўнага змагання беларускага сялянства з яго адвечнымі ворагамі. Найбольш каштоўным мастацкім дакументам гэтага цыкла з'явілася аповесць «Салавей», якая атрымала шырокую вядомасць сярод нашых чытачоў.

І раней увагу пісьменніка брала тэма маральнай перавагі простага чалавека над прадстаўнікамі пануючых класаў. Абвінавачванне па адрасу эгаістычных, бессардэчных паноў, напрыклад, з'яўляецца апавяданне «Бондар», якое адначасова з'яўляецца яскравым сведчаннем адоранасці і працавітасці простага чалавека, глыбокай адданасці яго свайму майстэрству, сваёй працы—творчасці.

Аповесць «Салавей» сцвярджае гордую чалавечую асобу, якая паўстала супроць ланцугоў сацыяльнай няволі,—у гэтым творы да вышыні ўсенароднай справы ўзнімаецца роля мастацтва, якое не хоча быць пустой забавай у руках нікчэмных амаральных эксплаататараў.

Нараджэнне новага чалавека, разняволенага пролетарскай рэволюцыяй, робіцца цэнтральнай тэмай творчасці Бядулі совецкага перыяду. Да ліку лепшых апавяданняў, у якіх малюецца сацыялістычнае будаўніцтва на вёсцы, належаць «Шрам», «Крэўныя», «Свінарка Фрэйда» і інш. Селянін, абцяжараны дробнаўласніцкай ідэалогіяй, паступова вызваляецца ад перажыткаў мінулага і ў калектыўнай гаспадарцы знаходзіць сваё сапраўднае шчасце. Перамагае новае ў жыцці; на глебе агульных інтарэсаў устанаўліваецца больш глыбокая ўласная любоў і павага паміж людзьмі розных нацыянальнасцей. Не гледзячы на розныя біяграфіі, энтузіясты калгаснага ладу,— старшы брыгадзір Уладзік і свінарка Фрэйда — ужо цяпер родныя брат і сястра, паколькі яны абодва ўвасабляюць сабой станаўленне новага чалавека.

Змітрок Бядуля вядомы і як раманіст («Язэп Крушынскі»). Яго пяру належаць аповесці «Набліжэнне» пра жыццё беларускага мястэчка ў дарэволюцыйныя часы і «У дрымучых лясах»—цікавы аўтабіяграфічны твор пісьменніка. Яго вялікую творчую працу завяршаюць вершаваная нізка «Мурашка-Палашка» і фальклорная казка для дзяцей «Сярэбраная табакерка».

Пры ўсіх мастацкіх вартасцях іншых твораў Бядулі—празаічных і вершаваных, асноўнымі і найбольш улюбёнымі жанрам пісьменніка з'яўляюцца апавяданне, навела і аповесць. У іх знайшлі сваё поўнае выяўленне лепшыя якасці Бядулі-мастака.

Уменне адбіраць для твораў характэрныя з'явы жыцця, вялікія здольнасці псіхалагічнага раскрыцця вобраза, высокае майстэрства ў пабудове сюжэта, скупая, сціслая, але выразная мова, схільнасць да філасофскага роздуму, глыбока чалавечны гумар,—усё гэта робіць апавяданні і аповесці Бядулі каштоўным укладам у скарбніцу беларускай літаратуры.

Н. ПЕРКІН.

Фальклор у творчасці пісьменніка

Якуб Колас, Янка Купала і Змітрок Бядуля прынеслі ў літаратуру народнае светаадчуванне, дасканалае веданне народнай псіхалогіі.

Цікавасць З. Бядулі да фальклора паглыбляецца ў сувязі з яго работай у «Нашай ніве», якая аддавала вялікую ўвагу збіранню і вывучэнню фальклора.

Бядуля не толькі дасканала ведаў фальклор. У сваіх першых навелах ён паказаў лёс народных талентаў у дарэволюцыйных умовах, імкненне народа да творчасці.

Тэма народных талентаў была арганічнай для ўсёй беларускай літаратуры і аўтабіяграфічнай амаль для ўсіх яе пісьменнікаў. У поўнай глыбокага сэнсу баладзе М. Багдановіча «Музыка», у паэме Я. Коласа «Сымон Музыка» падаваўся працэс нараджэння мастакоў з народа.

З тэмай творчасці народа Бядуля не разлучаецца ўсё сваё жыццё. У 1913 годзе ён піша навелу «Вялікодныя яйкі», праз год, у 1914 г.,—апавяданне «Летапісец», а ў 1920 годзе—навелу «Бондар». Нарэшце, у 1926 годзе пісьменнік стварае выдатную аповесць пра прыгоннага артыста—«Салавей».

Вобразам народнага казачніка, дасціпнага на слова Мірона («Летапісцы») Бядуля сцвярджаў духоўную чалавечную годнасць беларуса.

Дзед Мірон, — увасабленне сялянскай жыццёвай філасофіі, адзін з носьбітаў вусна-паэтычных беларускіх традыцый. У пачатку навелы—перад намі звычайны селянін, адзін з тых беднякоў, з якімі мы пазнаёміліся па іншых апавяданнях Змітрака Бядулі.

Але досыць Мірону, забыўшы пра асабістыя няўдачы, пачаць апавядаць «летапіс» вясковых падзей, як ён адразу пераўвасабляецца. Мова яго вобразная і паэтычная, дасціпная і гіранічная, спрэс складаецца з прыказак з простай і ўнутранай рыфмай. З размоўнага кантэкста дзеда Мірона мы без цяжкасці вылучылі дваццаць пяць прыказак, сярод якіх сустракаюцца сацыяльна завостраныя, напрыклад: «Мінуліся тыя рокі, калі паны браліся ў скокі» і г. д.

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі З. Бядуля піша кнігу «Вера, паншчына і воля ў народнай творчасці», у якой, на падставе апублікаваных запісаў фальклора і ўласных нагляданняў, робіць вывады аб адносінах народа да рэлігіі, прыгоннага права. Цікавасць, якую выявіў З. Бядуля да беларускага фальклора ў гэтай кнізе, была хутчэй цікавасцю фалькларыста-этнографа, чым паэта.

Апрацаваўшы ў форме эпічнага сказу багаты беларускі фальклор («Палескія байкі»—1922 год), Бядуля паказаў, як палешукі-беларусы, якія жылі да рэволюцыі амаль патрыярхальным жыццём стварылі «своеасаблівы фантастычны свет, своеасаблівую філасофію дабра і зла, арыгінальна разважалі пра жыццё і смерць, стваралі космаганічныя і іншыя легенды»*).

Спробай стварэння беларускага эпаса з'яўляецца вялікая паэма «Ярыла» (1922—1924 г. г.), на вялікі жаль незакончаная паэтам. «Палескія байкі», «Ярыла» паводле свайго характару набліжаюцца да яго кнігі «Вера, паншчына і воля».

Бядуля ведаў фальклор як вучоны і ўмеў карыстацца ім як мастак.

Яскравым прыкладам творчага скарыстання фальклора служыць гістарычная аповесць «Салавей».

Працягваючы традыцыі рускай гуманістычнай літаратуры, (Грыбаедаў, Герцэн, Лясковў) аповесць «Салавей» вырасла на фальклорнай, глыбока нацыянальнай аснове. У «Салаўі», як ні ў адным з твораў З. Бядулі, фальклор адыгрываў вялікую і розпастайную ролю.

У гэтай аповесці З. Бядуля скарыстаў усё багацце фальклорных жанраў: лірычную песню, народныя замовы. Але перш за ўсё ў адпаведнасці з гераічным характарам аповесці Бядулю захапляюць гераічныя казкі з антыпрыгоннага цыкла.

Гераічныя казкі ўключаюцца ім у рамантычную лінію аповесці, бытавы фальклор узмацняе тыповасць, рэалістычнасць паказу прыгоннай вёскі, дапамагае глыбей раскрыць псіхалогію герояў.

Развіваючы ў «Салаўі» тэму барацьбы народа з прыгнятальнікамі, Бядуля звярнуўся да казак, «дзе існавала і, марачы пра лепшае жыццё, дзейнічала якаясьці свабодная, бясстрашная сіла» (М. Горкі).

Сюжэтная лінія аповесці, якая звязана з пратэстам Салаўя, яго ўцяканнем у лес і наступнай барацьбой з Вашамірскім, поўнасцю падказана пісьменніку казкамі «Іванка-Прастачок» і «Пану навука». Гэтыя казкі З. Бядуля запазычыў са зборніка А. Н. Сержпутоўскага*).

Запазычыўшы з казкі «Пану навука» схему, З. Бядуля ў раздзелах «Мніх бернардынец» і «Пан Скшамбжыцкі» напаўняе яе псіхалагічным зместам, арганічна звязаным з фабульным развіццём аповесці.

Лірычныя шэдэўры беларускага фальклора далі магчымасць Бядулі стварыць адзін з найбольш прывабных вобразаў аповесці—вобраз прыгоннай дзяўчыны Зоські, каханай Салаўя. Ключом да разумення характару Зоські з'яўляецца народная песня, змешчаная ў аповесці.

Есць у лузе каліна,
Пад калінай дзяўчына,
Пад калінай стаяла,
Цвет-каліну ламала,
Русу-косу часала і г. д.

У народнай паэзіі «каліна,—піша А. Н. Весялоўскі,—цнотнасць, дзяўчына, яна палымнее, і цвіце, і шуміць, яе ламаюць».

У вобразе «каліны» ўся Зоська, яе лірычная празрыстасць, духоўная чыстата, сацыяльны і асабісты лёс. За кожным аўтарскім словам, характарыстыкай Зоські,—мы адчуваем падтэкст лірычнай народнай песні.

Наяўнасць фальклору ў аповесці «Салавей» надала ёй народны каларыт і ў значнай ступені абумовіла поспех аповесці.

З фальклора запазычыў Бядуля жывую і жвавую мову для сваіх герояў. Ад фальклора—у Бядулі той мяккі народны гумар і гіронія, якія так характэрны для яго твораў.

*) З. Бядуля, том 1, стар. 349, ДВБ, 1937 г.

*) А. Н. Сержпутоўскі—«Сказки и рассказы белоруссов-полешуков», СПБ, 1911 г.

„САЛАВЕЙ" НА БЕЛАРУСКАЙ СЦЭНЕ

Лепшы твор Змітрака Бядулі «Салавей» мае заслужаную папулярнасць не толькі як аповесць, што вытрымала звыш 14-ці выданняў і перакладзена на многія мовы. «Салавей» быў пастаўлены на сцэне Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы і быў увасоблены ў балетны спектакль, які карыстаўся значным поспехам на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 годзе.

У кожнага мастака бывае ўлюбёны твор, якому ён аддае найбольш спелыя думкі, найлепшыя пачуцці, твор, у якім ажыццяўляюцца яго запаветныя мары. Бясспрэчна, што ў Бядулі такім творам з'яўляецца «Салавей»—не толькі аповесць, але і п'еса, і кіносцэнарый і балетнае лібрэта.

Вядома, інсцэніроўкі празаічных рэчаў вельмі часта бываюць горш за арыгінал. Драматургія мае толькі ёй уласцівыя законы, якія адрозніваюць яе ад прозы. У драме задума пісьменніка выяўляецца ў больш сціслай і дынамічнай форме, чым у празаічным творы.

П'еса «Салавей» мае тыя-ж заганы, у параўнанні з выдатнай аповесцю, як і шмат іншых інсцэніровак. Набыўшы большую прасталінейнасць, чым аповесць, у сэнсе зместу п'еса, усё-ж не была пазбаўлена апавядальнасці. Вобразы тут сталі больш схематычнымі, а мова страціла сваю сакавітасць. Аднак, глыбокая ідэйнасць аповесці, фальклорная прывабнасць яе мовы, рамантычнасць унутранага свету герояў не маглі не мець дадатнага ўплыву на тэатральнае ўвасабленне «Салаўя».

Л. Літвінаў—пастаноўшчык спектакля ў тэатры імя Янкі Купалы, кампазітар М. Крошнер, балетмайстра А. Ярмалаеў і рэжысёр «Салаўя» ў Беларускім Дзяржаўным тэатры оперы і балета працавалі пад непасрэдным уплывам аповесці і перанеслі на сцэну яе атмасферу.

Л. Рахленка і С. Дрэчын — стваральнікі сцэнічнага вобраза Сымона, С. Станюта—Алена і А. Нікалаева—Зоська, таксама як іншыя акторы, кожныя ў межах свайго жанру, імкнуліся як мага больш поўна раскрыць душэўны свет народных талентаў, рысы іх мужнасці, пратэсту супроць жорсткай сапраўднасці.

Л. Рахленка—актор-псіхолаг, з аналітычнай думкай і лірычным талентам з трох тэм вобраза Сымона, якія арганічна пераплятаюцца паміж сабой, Сымона-змагара супроць прыгоннага ладу, Сымона-паэта з багатай фантазіяй і Сымона, закаханага ў Алену, абраў галоўнай тэмай свайго сцэнічнага вобраза тэму Сымона-змагара.

Пратэст Сымона спачатку пасіўны, а потым дзейсны, які наспявае ў працэсе росту яго самасвядомасці, Рахленка праносіць праз увесь вобраз і робіць яго цэнтральнай тэмай спектакля.

Аднак артыст не ставіць свайго героя на рамантычныя «хадулі». Рахленка ў ролі Салаўя бачыць перад сабой жывога чалавека, які радуецца і пакутуе, тужыць і гневаецца. Вядома, у п'есе ў Сымона параўнальна мала канкрэтнай чыннасці. І таму Рахленка паказвае нам мужнасць думкі і імкненняў героя, яго псіхалагічную гатоўнасць да актыўных учынкаў. Тое, што вобраз Рахленкі-Сымона бліжэй да аповесці і інтэлектуальна багацейшы чым Салавей у інсцэніроўцы, сведчыць аб глыбокім разуменні артыстам і рэжысёрам творчай ідэі пісьменніка, якую яму больш удалося раскрыць у прозе і менш выразна ў драме.

У Станюты ёсць пэўны нахіл да рэзкіх сцэнічных фарбаў—да чорных і белых. Ёй менш блізкія паўтоны. Асабліва гэта адчувалася ў некаторых мінулых ролях, якія іграла артыстка. Вобраз Алены артыстка імкнулася раскрыць у пластычна-выразнай тэатральнай форме.

У такіх рэзка-акрэсленых фарбах нам запомнілася яе Алена, у вобразе якой раскрываецца трагічны лёс маладой сялянкі ва ўмовах прыгонніцкага грамадства.

Калі драматычны спектакль «Салавей» не цалкам адпавядаў мастацкай глыбіні аповесці, дык ва ўсякім разе ён праз вобразы Сымона, Марылькі (арт. І. Ждановіч), чорнабародага Язэпа (арт. У. Уладамірскі), Каспара (арт. Г. Грыгоніс), Каспарыхі (арт. Ржэцкая) і іншых нагадваў нам некаторыя лепшыя старонкі аповесці і, галоўнае, яе вострую палітычную накіраванасць супроць панскага прыгнёту.

Балетны спектакль «Салавей» меў больш мастацкіх лёс, чым драматычны, які, параўнальна нядоўга, захаваўся ў рэпертуары тэатра імя Янкі Купалы.

«Салавей» М. Крошнера з'яўляецца першым беларускім балетам і, такім чынам, ён набыў асаблівае значэнне ў гісторыі нашага оперна-балетнага мастацтва.

«Салавей» перажыў на беларускай балетнай сцэне два варыянты—першы сацыяльна больш завостраны, дзе выразна гучыць тэма пратэсту Сымона супроць прыгону і другі—у якім асноўныя сюжэтныя калізіі адбываюцца ў межах любоўнага трохкутніка—Сымон, Зоська і ненавісны Зосьцы панскі гайдук Макар. Балет быў паказаны на дэкадзе беларускага мастацтва і быў дадатна ацэнены сталічнай маскоўскай грамадскасцю і цэнтральным друкам.

У перадавым артыкуле часопіса «Тэатр» (№ 7 за 1940 г.) «Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве» мы чытаем: «У дні дэкады мы бачылі першы беларускі балет «Салавей». Які нястрыманы тэмперамент, якую імклівасць паказалі маладыя артысты балета ў гэтым спектаклі. Няхай маладому калектыву нехапае сталасці ва ўсіх дакладнасцях класічнага жанра, няхай багацце фальклорнага матэрыяла засланяе індывідуальны твар кампазітара, няхай ёсць значныя недахопы ў лібрэта, не гледзячы на гэта, «Салавей»—вялікі і радасны поспех беларускага мастацтва. Першая і галоўная яго вартасць у тым, што харэаграфічная аснова спектакля—народныя танцы—з'яўляюцца не простай дэманстрацыяй фальклорных танцаў, накшталт «Лявоніхі», «Крыжачка», «Юрачкі», «Бульбы», а арганічна спалучаюцца з развіццём усёй драматычнай дзеі балета. Народныя танцы скарыстаны ў спектаклі не ў якасці дывертысментных нумароў, а як асноўны элемент музычнай і сцэнічнай характарыстыкі дзейных асоб. Яны не з'яўляюцца толькі арнаментам—у іх заключаны самы змест, самая сутнасць сцэнічнай дзеі».

Калі вобраз Салаўя—этапны ў акторскім жыцці Л. Рахленка, дык для Дрэчына гэты вобраз быў экзаменам на мастацкую сталасць.

Артыст тут сустрэўся не са звычнай для яго партыяй далікатнага кавалера, а з жывым сцэнічным вобразам, з шматгранным чалавечым характарам.

Вядома, трактоўкі партыі ў першым і другім варыянце балета розныя. У першым варыянце ў адпаведнасці з рэжысёрскім тлумачэннем больш выразна гучэла тэма пратэста «Сымона» супроць прыгоннага ладу, а ў другім—тэма кахання да Зоські стала асноўнай тэмай вобраза. Але каханне Сымона не мае інтымнага, ці адультэрнага характару.

Каханне Сымона-Дрэчына—праява гуманістычнага светаадчування народнага героя, яго змагання за права на чалавечую годнасць, за права на светлае і радаснае пачуццё.

С. Дрэчын паступова раскрывае перад гледачом росквіт свайго пачуцця. Шчыры і наіўна-непасрэдны ў першай, па вясеннім светлай карціне балета, Сымон Дрэчын робіцца гнеўным і волатна-мужным у сутычцы з гайдукамі і з нялюбым Зосьцы Макарам. У сцэне з Вандай (арт. З. Васільева) — сцэна паслушэнства — Дрэчын перадае глыбокую нянавісць да паненкі, нянавісць, якая асабліва напаўняе імклівы, поўны драматызма танец з бізуном.

Вобраз Сымона-Дрэчына быў мастацкі праўдзівым і пазбаўленым наіўнага сацыялагізма. Зоська—была этапным вобразам у сцэнічнай біяграфіі артысткі А. Нікалаевай. Тэмай вобраза Зоські-Нікалаевай, якая добра запомнілася гледачу—было адданае каханне да таленавітага юнака Сымона і шчырая нянавісць да панскага гайдука Макара.

Гэтай тэмай прасякнута ўся танцавальная партыя Зоські, яе адажыё, варыяцыі, у якіх балетмайстрам зроблена спроба спалучэння класікі з беларускім народным танцам, спроба, якая яшчэ не знайшла дасканалага вырашэння і застаецца праблемай для другога арыгінальнага балетнага спектакля «Князь возера» В. Залатарова.

Варыяцыя Нікалаевай у трэцім акце прагучэла, як драматычная паэма аб горы і душэўных пакутах дзяўчыны, сэрца якой імкнецца да шчасця але не валодае гэтым шчасцем.

«Салавей» Змітрака Бядулі прынёс на нашу сцэну выразныя малюнкі барацьбы беларускага народа з прыгонніцкім ладам, з польскімі панамі за светлую волю і шчаслівую долю. Гэты твор зрабіў плённы ўплыў на развіццё тэатральнага мастацтва цэлай плеяды драматычных і балетных акторaў на выхаванне іх мастацкага густу.

А. КАМЕНСКІ.

ДА ГАСТРОЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ЛЯЛЕК

У час сваіх гастроляў у Мінску Дзяржаўны тэатр лялек БССР пакажа дзецям і дарослым лепшыя спектаклі свайго рэпертуара, якія характарызуюць увесь творчы шлях калектыва з моманту аднаўлення яго дзейнасці, г. зн. з мая 1944 года.

Наш юны глядач убачыць п'есу-алегорыю заслужанага артыста РСФСР, лаўрэата Сталінскай прэміі С. Абразцова і С. Прэабражэнскага «Вялікі Іван». Гэта п'еса аб нашым рускім народзе, аб яго мудрасці і магутнасці, аб яго барацьбе з цёмнымі і злымі сіламі і аб яго перамозе.

Любімы дзецьмі спектакль «Каштанка» Е. Сперанскага (паводле Чэхава) будзе таксама паказаны дзецям сталіцы згодна просьбы многіх педагогаў школ г. Мінска.

У п'есу «Каштанка» аўтарам уключаны і інсцэніраваны тры апавяданні А. П. Чэхава «Хамелеон», «Каштанка» і «Размова чалавека з сабакам».

Самыя маленькія гледачы—вучні першага — другога класаў і дашкольнікі ўбачаць спектакль «Па шчучаму вяленню» Е. Тарахоўскай. Тэатр пакажа таксама свае новыя спектаклі, якія яшчэ не ішлі ў Мінску. Гэта п'есы: «Чароўныя падарункі» («Дзед і жораў») Віт. Вольскага, «Кот у ботах» Г. Уладычынай (паводле казкі Перро), «Канёк-Гарбунок» Е. Курдзюмеева (паводле Яршова) і навагоднюю казку для дзяцей сярэдняга і малодшага ўзросту—«Дзед Мароз» Е. Шурынавай.

Калі праглядзець рэпертуар тэатра лялек, дык мы ўбачым, што ў рэпертуарных лістках часцей за ўсё сустракаюцца назвы розных казак. У сувязі з гэтым нам часта даводзіцца чуць папрокі ў празмерным культываванні казак.

Не адмаўляючы факта вострай неабходнасці папоўніць рэпертуар тэатра сучаснымі п'есамі, мне хацелася-б сказаць некалькі слоў аб казцы. Многія забываюцца на тое, што казка—гэта жанр, а жанр, як вядома, ніколі не можа вызначаць тэму. Казка і сучаснасць не могуць з'яўляцца разуменнямі, якія ўзаемна выключаюць адзін аднаго, казка не можа быць супроцьпастаўлена палітычнай надзённасці. Я не памылюся, калі скажу, што казка мае сваю палітычную накіраванасць. Пытанне толькі ў правільным ідэалагічным вырашэнні зместу казкі.

Казка жыве ў нас сваім жыццём, паводле сваёй логікі і сваіх законаў. Але там, дзе жывуць і дзейнічаюць героі і вобразы казкі, жывуць тыя самыя пачуцці і ідэі, што маюць месца і ў нашай рэчаіснасці, а іменна мужнасць, самаадданасць, смеласць, вернасць абавязку, любоў да працы, любоў да сваёй Радзімы.

Вось таму пры правільным вызначэнні і вырашэнні тэмы і ідэі твора казка робіцца калі не ў поўным сэнсе сучаснай, дык, ва ўсякім разе, пераклікаецца з жывым вопытам нашай сучаснасці.

Да гэтага мы імкнемся ў кожным спектаклі, у гэтым, нам здаецца, сэнс і значэнне нашай работы над старой і сучаснай казкай.

Зусім неабходна каб нашы драматургі і дзіцячыя пісьменнікі зацікавіліся работай для тэатра лялек. Наш тэатр больш за ўсё адчувае вострую патрэбу ў сучаснай беларускай казцы і, мне здаецца, што не будзе несправядлівым папрок нашым драматургам у тым, што яны маюць перад адзіным дзіцячым тэатрам Беларусі неаплочаны рахунак.

Такі-ж папрок мы можам кінуць і Кіраўніцтву па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, якое вельмі мала дапамагае нам у папаўненні рэпертуара нашага тэатра беларускімі п'есамі.

Тэатру ўсё-ж хочацца верыць, што ў час нашых гастроляў у Мінску беларускія пісьменнікі, асабліва дзіцячыя пісьменнікі Я. Маўр, А. Якімовіч і другія пераканаюцца ў тым, што пісаць п'есы для дзіцячага тэатра—вельмі цікавая і патрэбная справа.

М. БАБУШКІН,
мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага тэатра лялек БССР.

Дабралюбаў і пытанні літаратурнай крытыкі

(Да 85-годдзя з дня смерці)

Дабралюбаў і Чарнышэўскі—правадыры рэвалюцыйнай дэмакратыі 60-х гадоў, былі адзінымі рускімі мысленікамі, якія ў тую эпоху дасягнулі вяршыні дамарксаўскага матэрыялізма. Яны з'яўляюцца бліжэйшымі папярэднікамі марксісцкай крытыкі.

У крытычных артыкулах Дабралюбава пытанні літаратуры і эстэтыкі непарыўна звязаны з палітычнымі пытаннямі сучаснасці. Раскрываючы сэнс мастацкага твора, ён у той-жа час арыентаваў пісьменнікаў і чытачоў у пытаннях рэчаіснасці, якая выклікала з'яўленне мастацкага твора. Дабралюбаў—аўтар твораў «Што такое абломаўшчына?», «Калі-ж прыдзе сапраўдны дзень?», «Прамень святла ў цёмным царстве» і іншых — узначальваў грамадска-рэвалюцыйны рух эпохі.

Рэвалюцыйны дэмакрат, ён меркаваў пра людзей на падставе іх учынкаў, а не на падставе іх намераў. І ў мастацкай літаратуры яго цікавілі ў асноўным аб'ектыўныя вынікі пісьменніцкай працы, грамадская функцыя твора, а не суб'ектыўныя намеры аўтара. У артыкуле «Цёмнае царства» Дабралюбаў адзначаў: «Рэальная крытыка стасуецца да твора мастака якраз таксама, як і да з'яў жыцця. Яна, вывучаючы іх, намагаецца вызначыць іх уласную норму, сабраць іх істотныя характэрныя рысы, але зусім не робячы мітусні з-за таго, чаму гэта авёс—не жыта, а вугаль—не алмаз». Такі падыход да мастацкага твора дазволіў Дабралюбаву глыбока раскрыць рэвалюцыйнае значэнне твораў тых пісьменнікаў, якія не падзялялі рэвалюцыйных перакананняў.

Сцвярджаючы рэвалюцыйнае значэнне твораў такіх пісьменнікаў, Дабралюбаў выходзіў з спецыфічных асаблівасцей мастацкага мыслення вобразамі. Разам з тым, ён прынцыпова паставіў пытанне пра ролю перадавога рэвалюцыйнага светапогляду ў мастацкай творчасці. «Мастак, які кіруецца справядлівым пачаткам у сваім агульным разуменні,—гаворыць Дабралюбаў,—ўсё-такі мае тую выгаду перад неразвітым або няправільна развітым пісьменнікам, што можа падпадаць пад уплыў сваёй мастацкай натуры, але калі яго агульныя разуменні фальшывыя, у ім непазбежна пачынаецца барацьба з самім сабою, нерашучасць, і калі твор не робіцца ад гэтага канчаткова фальшывым, то ўсё-такі атрымліваецца слабым, бясколерным, нязграбным». У артыкуле «Калі-ж прыдзе сапраўдны дзень?» Дабралюбаў паказвае, як памяркоўны тургенеўскі лібералізм абумовіў невыразнасць і бясколернасць вобраза рэвалюцыйнага героя Інсарава ў рамане «Напярэдадні». У артыкулах пра пісьменнікаў-разначынцаў Нікіціна, Кокарава і Славуцінскага Дабралюбаў гаворыць аб тым, як абмежаванасць светапогляду гэтых пісьменнікаў адмоўна адбілася на іх мастацкай творчасці.

Артыкулы Дабралюбава выхоўвалі пісьменнікаў-разначынцаў у духу перадавога рэвалюцыйнага светапогляду. У артыкуле «Вершы Івана Нікіціна» Дабралюбаў абвясціў: «Сучаснасць чакае такога паэта, каторы з прыгажосцю Пушкіна і сілаю Лермантава ўмеў-бы прадоўжыць і пашырыць здаровы бок вершаў Кальцова».

Такім патрабаваннем арганічнага адзінства высокай мастацкасці і народнасці паэзіі вызначылася барацьба Дабралюбава за рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак у рускай літаратуры. «Адпаведна з шырынёю погляду і сілай пачуцця аўтара,—гаворыць Дабралюбаў у артыкуле «Прамень святла ў цёмным царстве»,—будзе адрознівацца здольнасць выяўлення прадметаў і здольнасць выкладання кожнага».

Заклікаючы пісьменнікаў выпрацаваць рознабаковасць погляду, «прасякнуцца народным духам, адчуць усё тым простым пачуццём, якім валодае народ», Дабралюбаў сцвярджаў неабходнасць поўнага адмежавання ад тагочаснага ўкладу жыцця. У перакладзе на бесцэнзурную мову—гэта азначала неабходнасць рэвалюцыйнага перавароту.

У артыкуле «Рысы характарыстыкі рускай простанароднасці» Дабралюбаў паставіў перад пісьменнікамі задачу «праследаваць рэшткі прыгоннага права ў грамадскім жыцці і дабіваць народжаныя імі разуменні, узводзячы іх да карэннага па-

чатку». Ставячы перад сучаснай літаратурай рэвалюцыйную задачу, Дабралюбаў адначасова ставіў эстэтычную праблему. «Патрэбна выпрацаваць у душы цвёрдае перакананне ў неабходнасці і магчымасці поўнага адмежавання ад сучаснага ўкладу жыцця «для таго,—пісаў Дабралюбаў,—каб атрымаць сілу выяўляць яе паэтычна... Толькі тады здолеем мы вылучыць нармальнае чалавечае ў гэтых з'явах ад усяго гвалтоўнага, штучнага, выпадкова ім навязанага».

Апярэджваючы пастаноўку праблемы чалавечай асобы, зняважанай і пакалечанай сацыяльнымі абставінамі, у творах рэвалюцыйнага гуманіста Максіма Горкага («Страсці-мардасці» і «Гарадок Акураў»), Дабралюбаў пісаў: «Але гэтая самая агіднасць і пошласць... паказвае нам на неабходнасць правільнага свабоднага развіцця і ўзнаўляе перад намі годнасць чалавечай прыроды, пераконваючы нас, што нікчэмнасць і злачынствы не ляжаць у прыродзе чалавека і не могуць быць лёсам натуральнага развіцця».

Дабралюбаў патрабаваў ад сучасных пісьменнікаў стварэння вобразаў цэласных і валявых новых людзей «з любоўю да справы, з гатоўнасцю стаць за праўду і не шкадаваць нічога для паражэння зла». І гэтае патрабаванне было зноў-такі выяўленнем рэвалюцыйна - дэмакратычнай эстэтыкі.

Вялікі рэвалюцыянер-дэмакрат Дабралюбаў адгукаўся сваімі літаратурна-крытычнымі артыкуламі на ўсе надзённыя пытанні сучаснасці. Выкрываючы ў артыкуле «Літаратурныя дробязі мінулага года» фразёрства і дробязнасць ліберальнай літаратуры, ён даводзіў неабходнасць размежавання рэвалюцыйных дэмакратаў з лібераламі, якія былі чужымі народу. У артыкуле «Што такое абломаўшчына?» барацьба Дабралюбава з лібералізмам звязваецца з вырашэннем рэвалюцыйных задач. Паставіўшы Абломава ў адзін рад з Анегіным, Пячорыным, Бельтавым і Рудзіным, ён сцвярджаў, што лібералы самых рознастайных адценняў кроўна звязаны з асуджаным на знішчэнне самадзяржаўна-прыгонным ладам. «Не хочацца ім (лібералам—Л. Б.) узняць рукі на тое дрэва, на якім яны самі выраслі».

Калі ў 1860—61 г. г. перад рускай рэвалюцыйнай дэмакратыяй асабліва востра паўстала праблема станоўчага героя рэвалюцыі, Дабралюбаў супроцьпаставіў у артыкулах «Калі-ж прыдзе сапраўдны дзень?» і «Прамень святла ў цёмным царстве» лібералам герояў, якія гатовы ўзняцца на рашучую справу і ўнутраныя запатрабаванні якіх супадаюць з патрабаваннямі абавязку. У артыкуле «Прамень святла ў цёмным царстве» Дабралюбаў бліскуча выкарыстаў вобраз гераіні драмы Астроўскага для таго, каб давесці, што ў Расіі складаецца рэвалюцыйная сітуацыя. Палымянымі заклікамі да рэвалюцыі гучалі заключныя радкі артыкула «Калі-ж прыдзе сапраўдны дзень?»: «Нядоўга нам чакаць яго. Прыдзе-ж ён, сапраўдны дзень...»

У артыкуле пра Дастаеўскага—«Забітыя людзі» Дабралюбаў раскрыў трагізм жыцця пад прыгнётам самаўладства і прыгонніцтва, якія ператваралі чалавека ў бяспраўную істоту.

Вялікі рэвалюцыянер-публіцыст Дабралюбаў непараўнальна больш справядліва, чым «крытыкі-эстэты» ацаніў асаблівасці твораў Ганчарова, Астроўскага, Шчадрына, Шаўчэнкі. Ён заўважыў фальшывае гучанне рамана Пісемскага «Тысяча душ». У артыкуле «Кабзар Тараса Шаўчэнкі» Дабралюбаў выявіў тонкае разуменне мастацкага рэалізма, вельмі блізкае да трактоўкі мастацкага рэалізма ў вядомым пісьме Энгельса да Марыэты Гаркнес. «Многа патрэбна паэтычнай сілы, — гаворыць Дабралюбаў,—каб узяцца за такія прадметы і не здрадзіць ім ні адным вершам, не ўнесці свайго сучаснага погляду ні адным намёкам. А Шаўчэнка якраз выканаў сваю справу так, што ва ўсёй паэме захавана поўнае адзінства і поўная вернасць характару казацкіх паўстанняў...»

Савецкія крытыкі, адной з асноўных задач якіх з'яўляецца кіраўніцтва барацьбой літаратуры за перамогу комунізма ў нашай краіне і развіццё грамадскіх праблем, узнятых пісьменнікамі, маюць у асобе Дабралюбава не толькі блізкага папярэдніка, але і настаўніка. Вельмі плённым з'яўляюцца ўстаноўкі Дабралюбава аб мастацкай цэласнасці твора, аб характары станоўчага героя, аб рэвалюцыйным гуманізме і іншыя. Артыкулы Дабралюбава глыбока павучальныя для савецкіх крытыкаў, якія павінны ўмець востра ставіць вялікія грамадскія праблемы і спалучаць партыйнасць крытыкі з дасціпным эстэтычным аналізам літаратурнага твора.

Л. БАРАГ.

Брыгада гуказапісаў у Беларусі

З 26 кастрычніка па 15 лістапада ў Беларусі знаходзілася брыгада работнікаў гуказапісу Усесаюзнага Радыёкамітэта.

На працягу тыдня ў Гродні брыгада запісвала народныя песні ў выкананні ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. У Мінск для запісу былі запрошаны хоры вёсак: Вялікага Падлесся, Баранавіцкай вобласці (кіраўнік Г. Цітовіч) і Азярышча, Рэчыцкага раёна (кіраўнік Т. Лапаціна). Таксама запісаны лепшыя беларускія песні ў выкананні народных артыстаў БССР І. Балоціна, Р. Млодэк, салістаў тэатра оперы і балета, філармоніі і радыёкамітэта.

Усяго запісана 94 беларускія музычныя творы, з якіх большая частка—народныя песні ў выкананні самадзейных калектываў.

Дом-музей Янкі Купалы

25 лістапада ў памяшканні Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР пад старшынствам акадэміка В. Перцава адбылося паседжанне журы конкурса на праект Дома-музея народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. У абмеркаванні праектаў, якія былі прадстаўлены на конкурс, прынялі ўдзел архітэктары, пісьменнікі і скульптары горада.

Журы прызнала, што ўмовам конкурса найбольш адпавядаюць праекты архітэктараў А. Воінава і І. Валодзькі. Між імі падзелены 2 і 3 прэміі.

КАМЕРНЫ КАНЦЭРТ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ

Саюз савецкіх кампазітараў БССР 3 снежня ў памяшканні Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі праводзіць камерны канцэрт беларускай музыкі. У канцэрце будуць выкананы творы заслужанага дзеяча мастацтва рэспублікі Я. Цікоцкага і кампазітара П. Падкавырава.

Творы беларускіх кампазітараў будуць выконваць — струнны квартэт Дзяржаўнай філармоніі БССР і салісты Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета—заслужаныя артысты В. Малькова, Н. Сярдобаў, артысты В. Фурс і В. Маркаў.

Вечар, прысвечаны памяці польскага паэта А. Міцкевіча

26 лістапада ва Усеславянскім Камітэце адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны памяці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. У ліку гасцей знаходзіліся Часовы паверанны па справах Польскай рэспублікі ў СССР п. Г. Вольпе, ваенны аташэ пры польскім пасольстве палкоўнік Бардан, члены і супрацоўнікі польскага пасольства, пасланнік Балгарыі ў СССР п. Н. Ніколаў, начальнік югаслаўскай ваеннай місіі ў СССР генерал-лейтэнант Палянац, ваенны аташэ пры Чэхаславацкім пасольстве брыгадны генерал Мразек. На вечары прысутнічалі дзеячы савецкай навукі — акадэмікі Б. Д. Грэкаў, А. Ф. Капусцінскі, прафесар А. А. Сідараў, савецкія пісьменнікі і артысты, генералы і афіцэры Савецкай Арміі, прадстаўнікі савецкай грамадскасці.

З дакладам аб жыцці і творчасці А. Міцкевіча выступіў член Прэзідыума Усеславянскага Камітэта украінскі паэт М. Рыльскі.

З прамовамі выступілі А. С. Гундараў і Г. Вольпе.

(ТАСС).

Новыя матэрыялы аб Н. А. Някрасаве

У сувязі з 125-годдзем з дня нараджэння Н. А. Някрасава Інстытут літаратуры Акадэміі Навук СССР прысвячае вялікаму паэту чарговыя нумары часопіса «Літаратурная спадчына».

Да юбілейнай даты выходзіць першая кніга. У ёй публікуюцца творы, якія не з'яўляліся яшчэ ў друку, ці малавядомыя вершы Някрасава. Друкуюцца яго празаічныя творы, крытычныя і публіцыстычныя артыкулы. Асабліва цікавыя аўтабіяграфіі паэта, якія ўпершыню сабраны і з'явяцца ў поўным выглядзе. Напісаныя, галоўным чынам, у часе перадсмяротнай хваробы, яны ярка характарызуюць душэўны ўздым Някрасава ў час стварэння «Апошніх песень».

Друкуюцца артыкулы А. М. Яголіна і Б. П. Казьміна, прысвечаныя пытанням рэвалюцыйных ідэалаў вялікага паэта, В. В. Гіпіуса — «Някрасаў у гісторыі рускай паэзіі», В. Е. Яўгеньева-Максімава — «Някрасаў — журналіст», А. Лаўрэцкага—«Літаратурна-эстэтычныя погляды Някрасава».

Вялікую цікавасць маюць невядомыя раней успаміны аб Някрасаве, у прыватнасці, недрукаваныя главы ўспамінаў Аўдоці Панаевай аб хатнім жыцці Някрасава і Івана Панаева, які на працягу гадоў загадваў рэдакцыяй «Сучасніка».

У раздзеле «Паведамленні і нататкі» публікуюцца розныя новыя матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю Някрасава. Сярод іх — два вершы А. П. Майкава, нявыдадзеныя лісты Дастаеўскага аб Някрасаве і Салтыкове-Шчадрыне, верш В. Гаршына на смерць паэта, апісанне бібліятэкі Някрасава, забароненыя царскай цэнзурай ілюстрацыі да яго твораў і г. д.

У першай палове будучага года выйдзе другая частка някрасаўскага тома «Літаратурная спадчына», прысвечаная, галоўным чынам, перапісцы.

(ТАСС)

Нар. арт. БССР лаўрэат Сталінскай прэміі П. Малчанаў і арт. Л. Гепнер у спектаклі «Так і будзе» К. Сіманава ў Беларускім Дзяржаўным тэатры імя Якуба Коласа.

На тэмы дня

БОЛЬШ УВАГІ МАСТАЦКАМУ ВЫХАВАННЮ МОЛАДЗІ

У нас шмат таленавітай моладзі, якая любіць мастацтва. Яна хоча бачыць у мастацкіх творах герояў нашага часу, людзей нашай эпохі, усю веліч нашай справы. Апрача таго, імкненне многіх дзяцей адлюстраваць у малюнках свае веды і назіранні, якія дзеці чэрпаюць з жыцця, выказаць свае думкі і пачуцці з'яўляецца іх жыццёвай патрэбнасцю.

У гэтым сэнсе выяўленчае мастацтва—магутны сродак выхавання. У ім дзеці знаходзяць жывую для іх мову, таму работы дзяцей часта захапляюць дарослых сваёй непасрэднасцю і арыгінальнасцю. У піонераў і школьнікаў нямала законных прэтэнзій да грамадскасці і арганізацый, якія займаюцца справай выхавання і адукацыі. Перш за ўсё стаіць пытанне аб пісьменным выкладанні малявання ў школах, аб знешкольна-гуртковай рабоце, аб стварэнні адпаведных устаноў і ўмоў для работы дзяцей у галіне выяўленчага мастацтва. У сапраўднасці ўсё гэта праходзіць самацёкам.

Вялікую дапамогу ў справе мастацкага выхавання дзяцей маглі-б зрабіць Саюз мастакоў і Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР.

Даўно наспела неабходнасць у стварэнні навучальнай установы, дзе-б дзеці вывучалі жывапіс і рысунак. У Беларусі неабходна адчыніць мастацкае вучылішча.

Трэба павесці рашучую барацьбу з безыдэйнасцю, пошласцю ў справе мастацкага выхавання дзяцей. На выстаўцы, арганізаванай у жніўні Міністэрствам асветы БССР, сярод бясконцых копій і перамалёвак можна было, напрыклад, знайсці перамалёўкі з вялікодных паштовак і безгустоўных рэпрадукцый. Мы абавязаны выступіць супроць прышчаплення падрастаючаму пакаленню чужых нам густаў і дамагацца паляпшэння ўсёй выхаваўчай работы.

Саюз мастакоў таксама павінен зрабіць з гэтага практычныя вывады і ў далейшым уплываць на работу па навучанню і выхаванню здольнай моладзі, прыцягваючы да гэтага майстроў мастацтва.

Аб'яўлены ЦК ЛКСМБ, Міністэрствам асветы БССР і Кіраўніцтвам па справах мастацтва конкурс на лепшы дзіцячы малюнак носіць пакуль што паказны характар і не мабілізуе грамадскасці школ і мастакоў перыферыі.

Амаль што адзіным месцам у Беларусі, дзе таленавітыя дзеці могуць вучыцца маляваць, з'яўляецца гурток выяўленчага мастацтва пры Мінскім Палацы піонераў. Саюзу мастакоў патрэбна было-б звярнуць на яго ўвагу. У рабоце гуртка па віне адміністрацыі Палаца піонераў пануе безадказнасць і бяспланавасць. Гурток не мае адпаведных умоў для сур'ёзнай работы. Ён незабяспечаны памяшканнем, неабходнымі матэрыяламі і абсталяваннем. Час для заняткаў вызначаецца ў нязручныя для школьнікаў гадзіны. Ва ўрон плённай работы наглядаецца пагоня адміністрацыі Палаца піонераў за большым ахопам дзяцей і прычым рознага ўзросту.

Вельмі каштоўнае ў рабоце гуртка—гэта сістэматычнае выхаванне актыўнага рэалістычнага ўспрымання навакольнай рэчаіснасці і натуры. Развіццё ўмельства бачыць і наглядаць пакладзена ў аснову выкладання.

Аднак, вышэйуказаныя хібы ў рабоце Палаца піонераў не даюць магчымасці з большым поспехам рэалізаваць задачы, што стаяць перад гуртком выяўленчага мастацтва.

С. КАТКОЎ.

„МЯШЧАНЕ“

У Баранавіцкім абласным драматычным тэатры

«Ведаеш, я люблю каваць. Перад табой чырвоная бясформеная маса, злосная, пякучая... Біць па ёй молатам — асалода. Яна плюецца на цябе шыпячымі, вогненнымі пляўкамі, хоча выпаліць табе вочы, асляпіць, адшпурнуць ад сябе. Яна жывая, пругкая... і ты моцнымі ўдарамі робіш з яе ўсё, што табе патрэбна».

У гэтых словах машыніста Ніла і заключаецца ідэйнае зерне п'есы. Прага жыцця, барацьба за лепшае жыццё, радасць творчай працы—вось рысы, уласцівыя Нілу. Марай аб жыццёвай праўдзе жывуць многія героі п'есы, але здзейсніць гэтую мару пакліканы толькі Ніл. Адсюль, галоўны канфлікт п'есы заключаецца паміж рабочым Нілам і мешчанінам Бесяменавым. Так вырашаны спектакль рэжысёрам і ўсім пастановачным калектывам.

На сцэне—пакоі Бесяменавых. У строгім раз і назаўсёды ўстаноўленым парадку размешчана мэбля. Тыповы малюнак застою мяшчанскага побыту. І вось у гэтай клетцы адбываецца напружаная барацьба людзей розных пластоў і поглядаў. Яны чагосьці чакаюць, чагосьці шукаюць, да нечага імкнуцца, да нечага надзвычай важнага рыхтуюцца. Як гаворыць Цецяраў, яны рыхтуюцца сыграць «штосьці фарцісімо». Людзі нездарма «наладжваюцца». Трывожыцца Бесяменаў: «Баюся я! Час такі... Страшны час! Усё ламаецца, трашчыць... хвалюецца жыццё...»

«Мяшчане» ствараліся М. Горкім у 1900—1902 гадах у час падрыхтоўкі першай рускай рэвалюцыі.

Абставіны барацьбы Ніла з Бесяменавым, атмасферу перадрэвалюцыйных дзён, трывогу адных і радасць барацьбы другіх адлюстраваў тэатр сваёй пастаноўкай, і ў гэтым заслуга ў першую чаргу рэжысёра-пастаноўшчыка, заслужанага артыста БССР Міцкевіча.

Ніл са сваёй ідэяй карэннай перабудовы жыцця з'яўляецца тут цэнтральнай фігурай. Кожнае з'яўленне яго на сцэне прыносіць здаровы подых, асвяжае душную атмасферу дома Бесяменавых. Тацяна са сваёй змрочнай філасофіяй нявер'я ў жыццё і тая святлее пры з'яўленні Ніла; яна нават закахалася ў яго.

Ніл, у выкананні актора Някрасава,—просты, адукаваны рабочы. На сцэне трымаецца ціха, залішне голасна не гаворыць маналогаў, не пазіруе, а паказвае простага земнага чалавека, які любіць жыццё і ўпэўнены ў тым, што гэтае жыццё трэба і можна перарабіць. Яго каханне да Полі чыстае і шчырае. Ён добра, па-чалавечаму перажывае гэтае каханне і радасць, не баіцца да самазабыцця аддацца ўсёй сваёй істотай гэтаму ўсеперамагальнаму пачуццю.

Толькі нам здаецца, што яго рэвалюцыйная, дзейсная мара пра лепшую будучыню павінна быць абвеяна рамантычнай прыўзнятасцю, паэтычнай узвышанасцю і натхненнем. «Жыць... слаўны занятак,—гаворыць ён.—Ездзіць на дрэнных паравозах восеньскімі начамі пад дажджом і ветрам... ці зімой... у мяцеліцу, калі вакол цябе няма прасторы, усё на зямлі ахутана цемрай, завалена снегам,—ператомішся ездзячы ў такі час, цяжка... небяспечна, калі хочаш, і ўсё-ж такі ў гэтым ёсць свая прыгажосць. Усё-ж такі ёсць». Гэта прага жыццёвых небяспек, дзёрзкі выклік прыродзе, прага барацьбы і прадчуванне радасці перамогі. Гэтыя пачуцці не могуць быць проста, па-бытавому, выказаны. Мару Ніла пра лепшую будучыню трэба зрабіць імклівай, падаць з глыбокай перспектывай. Ніл—натура палымяная. Ён да самазабыцця захапляецца сваёй справай, сваёй барацьбой, сваёй марай. Ніл—чалавек з вялікай воляй, з моцным характарам. Ён да канца адданы сваёй ідэі, ад якой ніколі ўжо не адступіцца.

Рэжысёр і выканаўцы правільна зразумелі твор М. Горкага. Канфлікт паміж Бесяменавым і Нілам з'яўляецца галоўным сацыяльным канфліктам спектакля. Але таксама не застаўся па-за ўвагаю і важны для п'есы канфлікт паміж Бесяменавым і яго дзецьмі Пятром і Тацянай. Гэтая барацьба не з'яўляецца асноўнай, вырашальнай. Пётр і Тацяна пашумяць і змоўкнуць, іх спрэчкі з бацькам дарэмныя, не маюць ніякіх вынікаў. Яны выдумалі сабе нейкую іншую праўду.

«Брэшаш, адна праўда!—гаворыць Бесяменаў.—Якая ваша праўда? Дзе яна? Пакажы». Гэтай праўды няма ні ў Пятра, ні ў Тацяны. Стары мае рацыю. Таму Бесяменаву (арт. Братаноўскі) няма чаго нападаць на дзяцей, пакутваць ад непаладак, якія нібы-та ёсць у сям'і, гэта значыць, разыгрываць трагедыю. У дзяцей яго няма мэты, няма ідэі, няма перад чым схіляцца. Яны нават больш агідныя за бацьку. Адкуль-жа канфлікт? Бесяменаў мае мэту. Ён любіць стары мяшчанскі лад, хаця апошні і занепадае, моцна трымаецца за яго і змагаецца за яго захаванне. Ён любіць дзяцей. Шчыра пакутвае ад таго, што Пятра выгналі з універсітэта, а Тацяна сядзіць у дзеўках. Праўда, гэтыя рысы акторам паказаны слаба. Бесяменаву няма чаго злавацца на сваіх дзяцей. Ён толькі жадае бачыць у іх схільнасць да чаго-небудзь. Мне цяжэй за ўсё,—гаворыць ён,—што не бачу я ў іх... ніякага характару... Нічога гэткага моцнага... у кожным-жа чалавеку павінна быць што-небудзь сваё... а яны нейкія... быццам-бы без твару».

Такім чынам гэты канфлікт не павінен гучаць нароўні з канфліктам паміж Бесяменавым і Нілам. Гэта асабліва трэба мець на ўвазе артысту Братаноўскаму.

Выканаўцы ролей Тацяны і Пятра (акторы Смірнова і Мядзведзкі) правільна зразумелі месца гэтых персанажаў у спектаклі. Ужо ў адным сказе, з якім звяртаецца Пётр-Мядзведзкі да Полі—«час ужо і чай піць», адчуваецца гаспадар, варты самога Бесяменава. Гэтыя маладыя людзі толькі гавораць аб жыцці, але не жадаюць яго перабудоўваць. Яны прымаюць толькі выгляд ворагаў мяшчанства, а самі яны—горшае выданне мяшчан, больш агіднае выданне, бо Пётр і Тацяна—людзі адукаваныя, якія паспрабавалі культуры і пажылі ў грамадстве. А Пётр нават выгнаны быў з універсітэта за ўдзел у забастоўцы. У ім, напэўна, аднойчы ўспыхнулі рэвалюцыйныя ідэі, але хутка згаслі, і Пётр схаваўся ў кусты. Цяпер-жа ён высмейвае і ненавідзіць грамадства. Якое грамадства? Ды тых-жа Нілаў, Цветаевай, Шышкіна. «Грамадства? Вось што я ненавіджу. «Чалавек павінен быць грамадзянінам перш за ўсё»—крычала мне грамадства ў асобе маіх таварышоў. Я быў грамадзянінам, чорт іх вазьмі!.. Я... не хачу... не абавязаны падпарадкавацца патрабаванням грамадства. Я—асоба. Асоба вольная...» Рэзка, з непрыемнай нервознасцю, з жаданнем стаць у позу выкрывацеля, але труслівага і абмежаванага, гаворыцца гэты маналог акторам, які да канца выкрывае бесяменаўскую пошласць Пятра, яго варожасць да ўсяго жывога і прагрэсіўнага.

Найглыбейшым песімізмам павявае і ад Тацяны. Для яе тэатр—падман, літаратура—падман і дзейнасць Ніла, Шышкіна і Цветаевай—падман.

У выкананні артысткі Смірновай Тацяна нудная і нецярпімая. Вось чаму Ніл пазбягае сустрэчы з ёю, што выразна падкрэсліваецца ў спектаклі. Але артыстка Смірнова па-майстэрску паказала сваё каханне да Ніла, да гэтага здаровага чалавека. Праз яе нудныя тырады бачна гэтае пачуццё. Пры з'яўленні Ніла яна ажывае, усміхаецца, твар яе святлее. Яна з хваляваннем сочыць за ім. Але няма ў гэтым каханні свабоды, шчырасці. І кахае яна баючыся. Рухнула надзея, і Тацяна вырашае скончыць жыццё самагубствам. Ёй у жыцці рабіць няма чаго. Толькі і гэтага акта самагубства яна зрабіць да канца не здолела. Тацяна не можа адыйсці ад свайго асяроддзя. «Жыць хачу»,—ускрыквае яна, калі крыху ачуняла пасля атручвання. І яна працягвае тое самае існаванне без радасці і надзеі.

Актор Мядзведзкі таксама правільна знайшоў зерне сваёй ролі. Ён крок за крокам асобнымі трапнымі, падкрэсленымі дэталямі выкрывае Пятра, як пустога балбатуна. Ён ужо пакорлівы, супакойвае бацьку: «Вось пачакаю яшчэ крыху... потым падам прашэнне». Не забывае таксама напомніць Шышкіну, што той бярэ ў яго сёмы рубель. Актор набліжае Пятра да замірэння з бацькам і да прыняцця ўсіх яго мяшчанскіх законаў і парадкаў. Таму словы Цецярава пра Пятра,—«ён крыху перайначыць гэты хлеў, перастаўіць у ім мэблю і будзе жыць як ты»,—знаходзіць поўнае, пераканаўчае сцверджанне ў выкананні гэтай ролі.

Нібы ў баку ад агульнай калізіі п'есы стаяць вобразы Пярчыхіна і Цецярава. Але гэта толькі здаецца. Яны падкрэсліваюць ідэйнае значэнне спектакля. Пярчыхін і Цецяраў — ахвяры сацыяльных умоў.

Актор Івагін стварыў прывабны вобраз крыштальна-чыстага і сумленнага чалавека. Прастата, наіўнасць і дзіцячая баязлівасць перад бесяменаўскім ладам жыцця, неразуменне ўсяго, што адбываецца навокал, не супраціўленне гэтаму злу, а жаданне ўсё пагадзіць у жыцці—вось рысы, якія зусім правільна перадаюцца акторам. Калі Ніл, Цецяраў, нават Ялена свядома змагаюцца супроць Бесяменава, дык Пярчыхін усім сваім ладам жыцця, сваёй наіўнасцю служыць гэтай-жа справе.

Цецяраў—гэта магутная фігура. Выканаўца гэтай ролі актор Алфееў данёс горкаўскую мару аб чалавеку, закладзеную ў гэтым вобразе. У яго выкананні Цецяраў надзелены рысамі высакародства, незалежнасці, чалавечай годнасці, выдатным розумам. Асабліва сардэчна, глыбока і пранікнёна ён паказаў каханне да Полі.

«Мяшчане»—ансамблевы спектакль. У ім няма акторскіх няўдач. Цветаева (артыстка Шкалярэнка), Шышкін (артыст Васілеўскі), Ялена (артыстка Касьянава), Сцепаніда (артыстка Дарская), Доктар (артыст Счэнсновіч) стварылі яркія запамінальныя вобразы.

Прывабны вобраз Полі стварыла артыстка Казлова. Яна чыстая і сумленная дзяўчына, простая і незалежная. Поля горача кахае свайго бацьку і пяшчотна па-юнацку—Ніла.

У спектаклі павявае маладосцю, свежасцю і жыццерадаснасцю. Горкаўская думка аб урачыстасці ідэй Ніла вырашана ў спектаклі проста. Глядач сімпатызуе Нілу, любіць яго і верыць у перамогу яго рэвалюцыйных ідэй. У гэтым і заключаецца асаблівая заслуга рэжысёра і калектыва тэатра.

А. КАМЯНІЦКІ.

Рэдкалегія: Л. Александроўская, А. Багатыроў, Г. Глебаў, П. Кавалёў, Якуб Колас, А. Куляшоў, А. Кучар (в. а. адказнага рэдактара), П. Пестрак, Г. Таран.

АТ 30958 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэвалюцыйная 3 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.